# БЕЛАРУСКІ СОНЬНІК

## І ХІРОМАНТЫЯ

з дадаткам Аракула

1937

# БЕЛАРУСКІ СОНЬНІК

Уложаны паводле найпаўнейшых крыніц снагадацяляў, з прадмовай, азначаных сноў і дабаўленьнем хіромантыі, астролёгіі, людзкіх прыметаў і карысных парад старых людзей.

# Прадмова.

Аднаго разу Фараон бачыў увасьне, як сем кароў худых зьелі сямёх кароў тлустых. Тае самае ночы ізноў нешта падобнае сьніцца яму... Бачыць ён быццам сем каласоў тоненькіх, худых ажывіліся і пазьедалі сямёх каласоў тоўстых-налітых.

Прачхнуўшыся Фараон, пазваў да сябе вядомага адгадчыка-знахара Язэпа і той разтлумачыў гэтыя сны вось як:

. . . Будзе — казаў ён — спачатку сем гадоў ураджайных. Трэ' як мага тымі гадамі рабіць запас, бо... пасьля гадоў ураджайных надойдзе сёмяхгадовы голад.

Вядома з гісторыі, што Фараон даў веру гэтым сваім сном і Язэпаваму тлумачэньню. І паставіў зараз-жа Язэпа гаспадаром над усімі Эгіпецкімі жытніцамі (сьвірнамі).

Ці дрэнна зрабіў Фараон, што паверыў у сны? — А надта добра! За сем гадоў першых Эгіпет назапасіў ядоміны і калі найшлі галодныя гады, ня мелі ніякага клопату і нат' прадавалі лішку дабра загранічу.

А вось прыклад другі. Не з Фараонам гэта было а з Беларусам. Фядос быў рыбаком.

Жыў над ракой у бедненькай хатцы — з ім яго жонка.

Аднае начы Фядос бачыць сон, быццам ён сьпіць... Не, ня сьпіць, бо відзіць як праздзьверы бязшумна ўвайшоў барадаты чалавек і кажа:

«Хадзі, бяры бо пакачуся!».

Прачхнуўся Фядос — нікога, нічога ні якага ў хаце. Кот толькі аблізваецца на прыпечку, смажаную рыбіну з патэліны з'еўшы.

Увайшла жонка.

— Проска, ці чуеш?

— Ну кажы...

— Хвароба яго..., казаў Фядос, чэшучы патыліцу, — мо' праўда, мо' не...

— Што, кажы — нецярплівілася Проска, — а то я зачну казаць.

— Ну а што ты?... калі цікавае дык кажы, — ажывіўся ён.

Яна пачала паведамляць яго аб тым, што апроч бульбы нічога не прыгатуе на вячэру.

— А ты лепей стаўчы кашу, пракінуўшы мукой...

— Надаела ўжо прасіпь: Маланьня й так ужо моршчыцца, як бяру ў яе муку лыжкамі, кажа «або адчапіся з гэткай пазыкай, або бяры адразу дзесятак хунтаў.

— Гм... Што-ж браць а калі яе аддасі.

Падумаў Фядос крыху, устаў з ложка і не захацеў казаць жонцы аб старыку, што зьявіўся яму ўвасьне.

— Мала што трылузіцца ў галаве ад клопатаў — рашыў ён.

Другім днём ізноў увасьне незнаёмы зблізіўся. Фядос нат‘ пазнаў яго. Яшчэ дзіцянём будучы бачыў ён гэтага памешчыцкага «Лёкая»-старыка, даўно адыйшоўшага на той сьвет.

Ізноў прашаптаў над вухам Хвядося.

„... Хадзі, бяры, бо пакачуся“. І гэтым разам Фядос прачхнуўся, плюнуў, паскрабаў патыліцу і пашоў шукаць паліва для печкі.

А калі трэцяй ночы трэці раз дух «лёкая» зьявіўся і казаў прост з плачам «хадзі! бяры, бо пакачуся»... ды дадаў яшчэ, каб Фядос хутка ішоў над раку дзе на ўзгор‘і пясчаныя валатоўкі — дык Фядос пачаў апавядаць гэтым разам сон жонцы.

Абоя парашылі, што скарб калі суджан дык не ўцячэ да раньня і... заснулі.

Рана ўстаўшы пакуль тое ды гэта... Шмат прайшло часу. Проска ўспомніла:

— Бяжы паглядзі... мо‘ і праўда скарб здаецца... вазьмі рыдлёўку.

Быў поўдзень. Фядос паціху ішоў да вядомае валатоўкі. Падыйшоў і акамянеў:

Валатоўка на-полы развалілася і нейкі цяжар пракаціўся ў раку. (па сьлядох адціснутых па пяску можна было думаць, што пракацілася бочка).

— Проска, сюды! — крычэў Фядос, пуляючы вачмі на сьлед, зроблены скарбам на пяску.

«Хадзі бяры, бо пакачуся» вось словы, якія яго мучылі цяпер.

— Чапіўся... тры дні набіваўся з золатам... Ах, Бо..!

Фядос сеў, асланіўся локцямі на каленьні і глядзеў бязмысьльна — адзервянелымі вачыма.

Прыбегла Проска...

Скарб скаціўся... Ня ўмелі браць... Не паверылі сну.

Абое стаялі на гары і спусьціўшы панура галовы пазіралі на бурлівую Дзьвіну.

---

Дарагі чытачу! Вось два прыклады — Фараон і Фядос і соткі тысячаў прыкладаў апісаў-бы я тутака і праканаў-бы за кожным разам, што сны (хоць ня ўсе) не на дарма здаюцца чалавеку.

Вякікую карысьць падчас можна з іх асягнуць.

Дзеля гэтага, пасьля доўгае працы і практыкаваньня ўлажыў я гэты соньнік, дадаў шмат цікавае веды з іншых тайных навук (Хіромантыя, Астролёгія і г. д.), а ва ўсей працы маей пры пісаньні гэтае кніжкі была адна пуцяводная думка: даць чытачу магчыма больш карысьці нават у соньніку.

**А. Васілеўскі**
Хіромант - графолёг.

Вільня, Полоцкая 4, кв. 7.

## Агульныя правілы для тых, хто хоча праўдзівыя сны сьніць.

1. Ня есьці перад сном мяся, капусты, гароху, бобу і наагул цяжкае стравы.

2. Ня піць гарэлкі, кавы і гарбаты.

3. Перад сном праветрываць хату, каб ня было ні дыму ні цяжкага паветра.

4. Перад сном ні з кім не сварыцца і не спрачацца.

5. Ня надта цёпла накрывацца.

Калі гэтых 5 радаў выпаўніш, ды сон сасьніцца пасьля паўночы, дык гэта будзе праўдзіва прарочы сон!

# А

Абамлець — прыкрая навіна.
Абдзіраць кару з дрэва — даведаешся аб праўдзе.
Абдзіраць скуру з авечкі — нявіннага скрыўдзіш.
Абмёрзлую пролубку абчышчаць — пачуеш карысную для цябе праўду.
Абмерыць зямлю пад новы будынак — дрэнны знак; пад сад, ці гарод — шчасьце.
Абнімаць нябошчыка — хвароба, прыкрасьць.
Абувацца ў старое абуваньне — падарожжа, новае абуваньне — незнаёмая падарожжа.
Абчапіцца клумкамі — будзеш мець шмат лішняга клопату.
Аглядаць гаспадарку — прыгатоўся к страце.
Агонь бачыць — радасьць, направа жыцьця (мароз і сьпякота).
Агуркі салёныя есьці — сьлёзы, беднасьць, зьбіраць з гароду — смутак.
Агрэст перабіраць — сьлёзы, варэньне агрэстовае есьці — радасьць.
Адбівацца ад пчолаў — папсуеш сабе інтэрас.
Адрэзаць увасьне сабе руку — памрэ хто, або ад'едзе; калі балела пры гэтым рука — блізкі, а калі не — дык памрэ або ад'едзе хтось далёкі.
Адходзіць у дарогу плачучы — будзеш весяліцца.
Азярод запоўнены — багацтва, пусты — беднасьць.
Аксаміт чорны бачыць — смутак, жалоба.
Акушэрку спаткаць увасьне — асьцярога перад

клопатам для мужчыны, кабетам хваравітасьць.
Алей піць — быць хворым, — хуткае выздараўленьне.
Амбіцыю мець — добра інтарэсы пойдуць.
Андарак апрануць — чакай гасьця, мыць яго — цябе кінулі абмаўляць.
Антыхрыста бачыць — нячыстае сумленьне.
Анучы чыстыя сушыць — прыемная падарожжа, брудныя — прыкрасьці ў дарозе.
Аптэку сьніць — хвароба збліжаецца.
Армію бачыць — пажар.
Армяк — гатоўся ў падарожжу.
Аружжа аглядаць — сьцеражыся зладзейства.
Аружжа чысьціць — будзь асьцярожны прад зьвяром, ці дрэнным чалавекам.
Атруту браць у рукі — небясьпека, выпіць яе — цяжкое жыцьцё.
Аўчынку добрую трымаць у руках — прыемнасьць, радасьць, удача; аблезлую — стратнасьць.
Ахварбаваць адзежу (вопратку) цёмнаю хварбай— смутак, сьветлаю, або чырвонаю— вясёласьць.
Ахвяру даваць на касьцёл ці царкву — даход.
Ашукаць каго — бач каб сам ня быў ашуканы.
Аэроплян бачыць — навіна, садзіцца ў яго пры добрай пагодзе — хуткая радасьць, пры цёмнай і бурлівай — смутак і небясьпека.

## Б

Багатым быць — паправіцца жыцьцё.
Бажыцца — будзеш сьведкай.
Бараніцца — клопат.
Бараду мець густую ўвасьне — багацтва, грошы, знаходка.

Банькі стаўляць — ты сам, ці блізкі з хваробы паправіцца.
Балота — непрыемнасьць, плёткі, абмова.
Балахон — падарожжа.
Барану правіць — добра; з бараны вываліваюцца зубы — страты ў гаспадарцы.
Барышы піць — закончыш інтэрас.
Барсука злавіць — неспадзеваная ўдача, радасьць.
Біцца з кім — прыб'ецца нехта чужы, калі да крыві — дык свой.
Бізун бачыць — пагроза, будзь асьцярожны.
Блаху біць — малая прыкрасьць.
Бліны есьці — добрае значэньне, удача.
Боты новыя — прыемная падарожжа, парваныя — прыкрая.
Боб — сварка, есьці сыры — клопаты; боб лушчыць — добра.
Босым хадзіць увасьне — недастатак, чыстае сумленьне.
Брама, праз яе выходзіць — падарожжа.
Брахню сабакі чуць — малаважныя навіны.
Брусьніцы перабіраць — сьлёзы, есьці — добра.
Бульбу несьці — клопат, які выйдзе на добрае.
Бульбу скрабаць — атрымаеш занятак.
Бацяна (бусла) лятучага бачыць — пераездка, на гняздзе — спадзевайся гасьцей; да бацяновага клокату прыслухавацца—важныя выпадкі між родных.
Буяніць — неспакой з суседзямі.
Бурнос апрануць — дарога.
Будаваць новую хату — часам хаўтуры блізкіх, нікаторым добрая зьмена жыцьця.
Буракі — добра.
Бутэлька пустая — дрэнна, смутак, бутэлька поўная гарэлкі — даход, барышы.
Бурбулькі над вадой — навіны, малыя перашкоды.
Быдла біць — нехта прыб'ецца.
Быдла выганяць з хлеву — небясьпека, рызыка.

Быка тлустага — даход, худога — страты.
Бярвеньня часаць — добра, пачатак добрага інтарэсу.
Бярвяно ў чацьвярох несьці — хаўтуры.
Бялет чугуначны страціць — прыкрасьць ад чужых, на бялет прыглядацца, ці браць у кішэнь — падарожжа чугункай.
Бярэзіну зрэзаць — нявольна зробіш шкоду суседу.

## В

Валасы часаць — чакай гасьця.
Ваўкалака бачыць — асьцерагайся злога чалавека.
Валачобнікаў прыняць — пацешысься, чуць іх сьпевы — пачуеш навіны.
Вагон пасажырскі бачыць — госьць прыедзе, самому ў вагон садзіцца — будзеш у гасьцёх.
Ваўка забіць — пазбудзешся клопату.
Ваду ўвасьне піць мутную — хвароба, чыстую — здароўе.
Вапну разводзіць — пабагацееш з вялікім трудом.
Вагу бачыць — справядлівасьць, суд.
Вакно з пабітымі шыбамі — страты, беднасьць, з чыстымі і цэлымі — шчасьлівае жыцьцё.
Валіцца з гары ўніз — няўдача.
Вазіць гной — будзеш на хаўтурах.
Вал ў бачыць тлустых — багацьце, худых — беднасьць, недастатак.
Верацяно вярцець — навіны, абмова.
Вінаваціць каго — спрэчка.
Віхор — клопат, неспакой.
Віно піць — добрае значэньне.
Вошы — беднасьць, смутак (некаторым прыбыль).
Вошы біць — добры знак, удача,
Вопратку латаную чорную бачыць — непамыснасьць, надзець яе — хвароба.

Войска — пажар, ці іншая небясьпека.
Вулей бяз пчол — страта, смутак; з пчоламі — даход, радасьць.
Вучыцца — пільнуйся свайго, мей рупнасьць.
Вугальле гаручае — багацтва, халоднае — беднасьць.
Выбіраць з зямлі бульбу — клопат (на карысьць).
Выежджаць з дому — зачнеш інтэрас ці службу.
Выганяць быдла ў ночы — небясьпека ад пажару..
Выстралы чуць — неспадзеваная вестка, навіны
Вымятаць сьмяцьцё з хаты — адчэпіцца лішні клопат.
Вяроўкі віць — падарожжа.
Вязьмом вязаць сноп — даходны інтэрас.
Вядро пустое — смутак, поўнае — радасьць, дастатак.
Вяслом грабсьці — падарожжа.
Вянок з кветак чырвоных — каханьне, сініх і белых — спакойнае жыцьцё; вянок з кветак цёмнае ахварбоўкі — прыкрасьці і няўдачы.

## Г

Галіцца (брыцца) — госьці, расходы.
Гарачую страву тарапліва есьці — небясьпечны даход.
Галаву абвязаць хусткаю — для мужчыны лішні клопат, для кабетаў — пара ужо брацца за выкананьне задуманае працы.
Гальлё сабіраць і ў мейсца лучыць — будзеш мець важнае здарэньне.
Галень у руцэ трымаць — мала пацехі, ім падмятаць — мала дабраты.
Гадзіньнік — кінь ляніцца, бо час хутка праходзіць.
Гарбуз сьвежы — добрая навіна, стары гарбуз — лішні клопат.

Галавешка з дымам — сварка, з агнём — радасьць.

Гару бачыць — перашкода.

Гаварыць увасьне самому з сабой — нявыясьнёнае палажэньне, клопат, нездаваленьне.

Гасьцей прымаць — выдаткі.

Ганіць кагось — з цябе нехта сьмяецца.

Гаварыць увасьне — будзеш пацешаны.

Гальштук на шыю завязваць чорнага калёру — смутак, непамыснасьць, сьветлага калёру — будзеш рад у гасьцёх.

Галава баліць увасьне — клопат, (але гэткія сны бываюць і пры нястраўнасьці).

Гвоздзі новыя — умацаваньне гаспадаркі, даход, старыя гвоздзі, — спадак або падарунак.

Гінуць на вайне — небясьпека, смутак.

Глыбока тануць у чыстай вадзе — нязначны клопат, у балоце — надта дрэннае значэньне.

Глухім увасьне быць — аслабленае здароўе.

Гліну мясіць — дужа добра, есьці яе — бедната.

Гной вазіць — быць на хаўтурах; бачыць, як другія возяць — пачуеш аб хаўтурах.

Гняздо — сямейныя справы, нежанатым — жанімства.

Гніды мець — дробныя грошы атрымаеш.

Гнацца за кім — непатрэбна час страціш.

Гарбатым увасьне быць — прыбытак, яго стыдзіцца — ня зусім добрай дарогай гэты прыбытак атрымаеш.

Грэбень цэлы, новы — удачлівае выпаўненьне пляну, грэбень бяз зубоў (шчарбаты) — шмат прыкрасьцяў і недастаткаў пры выкананьні задуманага.

Грошы аблічаць — выдатак.

Грыбы есьці — небясьпека.

Грыву коньскую бачыць — добрае значэньне.

Град — неспадзяваная прыкрасьць ці сьлёзы.

Грабіць сена зімой — неспадзеванае шчасьце, улетку — таксама добра.
Губляць грошы ўвасьне — асьцерагайся стратаў.
Гусей крык — навіны, іхны прылёт — добра, адлёт — смутак.
Густым лесам ісьці — будзеш у кампаніі.
Гультаіць увасьне — перасьцярога ад праўдзівага гультайства на яве (значэньне благое).

## Д

Даўгі плаціць — пазбудзешся клопату.
Дарогу бачыць — госьці або падарожжа.
Дамавіна — вялікая прыкрасьць калі не хаўтуры.
Дарыць — дужа добра.
Давіць каго — несправядлівасьць.
Даіць кароў — даход, задаваленьне.
Дарагія каменьні мець — багацтва, спадак, выйгрыш.
Даручаць сваю працу камусь — хвароба, або звальненьне са службы.
Далатом рабіць — лепшае жыцьцё.
Дасужым быць — паправяцца інтарэсы.
Дамавога бачыць — перасьцярога перад прыкрасьцю ў сям'і.
Дакучаць камусь гаворкай — пусты клопат.
Даўнейшасьць успамінаць увасьне — спаткаеш прыяцеля.
Дзяцей лупцаваць — прыкрасьць.
Дзьверы зачыненыя — няўдача, адчыненыя — даб'ешся лепшага.
Дзікую сьвіньню бачыць — паважная небясьпека.
Дзёгаць піць — для хворага здароўе, для здаровага — невялікая прыкрасьць.
Дзікі чалавек — небясьпека.
Дзівіцца з чаго небудзь увасьне — пачуеш аб перамене.

Дзяліцца — убытак, аслабленьне.
Дзень ясны — добра, пахмурны — смутак.
Дзяўчыну прыгожую бачыць — клопат с перамена-
най на радасьць.
Дзярэўню (вёску) абкурываць зёлкамі — эпідэмія,
хваробы.
Дзюб пеўня — нязгода ў сямьі; дзюб качкі (вут-
кі) — абмова; дзюб птушкі — выпадак
з агнём. (укр. соньнік).
Дождж — смутак, сьлёзы.
Дрот калючы — асьцярагайся злога чалавека.
Дружыць з незнаёмым — карысьць, даход.
Дрэва з пладамі — набыцьцё маемасьці; дрэва
бяз лісьця — ашукаюць цябе; дрэва зялё-
нае, цьвітучае — вясёласьць, багацьце.
Калі хвораму сьніцца дрэва — выздаравее,
засохшае — хвароба далейшая або сьмерць;
дрэва ў вагне — смутак, жалаба.
Дрэва рубаць (сеч) — страта, садзіць — багаць-
це, зламаць — сварка.
Дуб — добрае здароўе.
Духі нюхаць — прыемныя навіны.
Дуду мець — клопат, іграць на дудзе — адзна-
чэньне паміж сваіх знаёмых.
Дурным быць — зробіш вялікую хібу (абмылку).
Духоўную музыку пачуць — смутак, людзям на-
божным — радасьць.
Дым уверх — удача, уніз — няўдача.
Дыплём атрымаць — канец клопатаў, заканчэнь-
не справы.

## Е

Ежа бачыць — навіна, браць яго ў рукі — не-
патрэбны клопат.
Еднацца з ворагам — знак добры.
Елку прыбраную цукеркамі (калядную) — шча-

сьлівае жыцьцё; ёлачку бедную бачыць бяз ніякага убранства — нездаваленьне, недастатак.
Ерша (рыбіну) злавіць — добра, гладзіць — перашкоды.
Есьці бліны — пісьмо атрымаеш.
„ боб — клопат.
„ гулкі — ашуканства.
„ брыбы — сьцяражыся нястраўнасьці.
„ гарох — сьлёзы.
„ гусінае мяся — пазбудзішся клопату.
„ курынае мяся — паправіцца жыцьцё.
„ паземкі — слёзы ад радасьці.
„ палын — хвораму здароўе, здароваму — хвароба.
„ радыску — карысная навіна.
„ слівы — нядобра.
„ сьвініну — хвароба.
„ хлеб — прыбыль, даход.
„ цукеркі — для маладых — прыемная знаёмасьць; старым — непатрэбны клопат.
„ яйкі — здароўе, удача.
„ яблыкі — добра.
Ехаць на кім-бы сабе ні было — шчасьце і ўдача
„ на гору — павышэньне на службе, або прыбыль у гаспадарцы.
„ уніз з гары — дренны знак.
„ па вадзе чыстай — удачлівасьць, па балоце — прыкрасьці, смутак.

## Ж

Жаніцца — перамена.
Жабу лавіць — пусты клопат.
Жарству есьці — перашкоды, цяжкае жыцьцё.
Жагнацца — будзеш мець падмогу; ня траць надзеі.
Жаніхом быць — шчасьце.
Жар заграбаць — пабагацееш.
Жаць — даход.

Жаласьлівы голас, або плач пачуць — па табе нехта нудзіцца.
Жалезам біцца — пачуешся моцным.
Жаробку воўк узяў — няўдача, страта.
Жлактаць гарэлку — будзеш на хрэсьбінах, ці у гасьцёх.
Жніво пачынаць — зачнеш мець даход; канчаць — пабядзееш крыху.
Жонку біць — вялікая прыкрасьць або хто нібудзь прыб'ецца.
Жорны абмятаць — недастатак.
Журыцца (маркоціцца, смуткаваць)— пацешышся, калі зьвернеш увагу на сваё здароўе.
Жука чорнага бачыць — невясёлая навіна.
Журавіны — карысная прыкрасьць.
Журнал гумарыстычны чытаць — пацешышся навіной.
Журава бачыць — пустая надзея.
Жуліка — ашукае цябе нехта.
Жывога нябошчыка спаткаць — перасьцярога перад няпрыемнасьцю (словы, пачутыя ад нябошчыка многа значаць).
Жывіцца ягадамі чорнымі — слёзы ад прыкрасьці, чырвонымі — слёзы ад радасьці.
Жыта ўмалотнае — багацтва, удача, паправа жыцьця.
Жыта недастатак — беднасць, няўдача.
Жыда старога — прадасі нешта.
Жыдоўку — купіш абноўкі.
Жыхара вёскі бачыць — спакойнае жыццё, жыхара горада (места) — клапатлівы інтэрас.
Жывот гладзіць хвораму — здароўе, здароваму — нястраўнасьць.
Жыраваць камусь вэксаль — гонар і павага ад другіх.

## З

Забагацець раптам — добры знак, калі бачым да

поўні месяца; благі адваротны, калі сьніш с поўні.

Забаўляцца ў жмуркі — сон ня мае вялікае вагі, але і нядрэнны.

Забыцца ня помніць таго, што бачыў увасьне — сон гэткі ня мае значеньня.

Заваражыць (ачараваць) дзяўчыну — новае, але ня доўгае знаёмства.

Завешаваць вакно чым чорным — смутак, або хваравітасьць каго з сямьі.

Завіруху (віхор, мяцеліцу, выцьцё ветра) пачуць — непрыемныя навіны.

Заверыць у войта павестку — атрымаеш грошы.

Замятаць сьмяцьцё (шуму) да аднаго мейсца — перацерпіш прыкрасьць, якая мела пашкодзіць.

Завярцелася (закруцілася) ў галаве — спаткае цябе вялікая радасьць, або паважны смутак, глядзячы якім днём сон сьніў, (дрэнна, калі сон гэты бачыш аўторкам і суботаю).

Загавець увасьне (ня поснымі днямі) — будзе страта, якая пасьля мусіць звярнуцца.

Загуляць умеру (не пьянеючы) — радасны знак даходу, знак карыснага інтэрэсу.

Загуляць (пьянстваваць) — будуць госьці, інтэрас з чужынцам.

Зазімаваць на панадворку — сьцеражыся судоў, ці пажару.

Закалоць (забіць) свіньню — пасьля клопату будзеш мець заспакаеньне тваіх жаданняў і дастатак у жыцьці. (Сон ня мае значеньня, калі кладучыся спаць думаў аб гэтым).

Залажыць фундамант у зямлю — пачнеш вельмі карысную працу.

Замок разглядаць — забясьпечся перад зладзеямі.

Замаркоціцца — на здароўі малае аслабленьне пачуеш.

раваць скарб у сьцяне — перасьцярога перад самузладзеям, або пажарам.

Замяніцца хатамі с кім — перамена.
Заплакаць — развеіцца злое і не памыснасьці, будзеш задаволены.
Зарэзаць авечку — мо' думаў аб гэтым перад сном, дык сон ня мае вагі, калі не, дык скрыўдзіш нявіннага чалавека.
Зарэзаць чырвонага пеўня — сьцеражыся агня.
Зарэзаць ваўка — пазбудзешся вялікага ворага.
Засеяць зёрны ў зямлю — даход, на воду ці каменьня — страты.
Засохнутае дрэва ля тваей будыніны — хаўтуры каго-нібудзь з радных, або якая непамыснасьць.
Засмуціцца — аслабленьне здароўя.
Заўрочыць каго — нехта мае на цябе „вока".
Захварэць — смутак, нездаваленьне.
Зьбіваць масла — пабагацееш.

## І

Іголку шукаць — страціш непатребна час.
Іголкай шыць — паправа шыцьця.
Іголкай укалоцца — непрыемнасць.
Іграць на цымбалах — надаясі камусь сваей гаворкай.
Іграць на скрыпцы песьні нудныя — смутак, вясёлыя — радасьць.
Імя сваё забыцца — абгавор, няўдача.
Ісьці на гару (уверх) — удача.
Ісьці з гары уніз — няўдача.

## К

Каза — здароўе, чэрствасьць.
Калёсы пустыя — недастатак.
Калёсы поўныя збожжа — багацтва.
Калосья на полі зьбіраць — невялікі даход.
Калекам зрабіцца — паважная страта і небасьпека.

Каламашку ладзіць (рыхтаваць) — для кавалераў знаемасьць, сваты; для паджылых і жанатых— падарожжа.
Калком граніцу абазначаць — зямельная справа (купля ці прадажа).
Калёсамі ехаць — добра, сон выпаўніцца ўлетку.
Кампрэсы на сабе бачыць — хвароба.
Кампрэсы класьці каму іншаму — пачуеш і паможаш у хваробе суседу.
Кандалы мець — вялікая прыкрасьць, скінуць іх — пацешышся.
Каршуна злавіць — пабядзіш ворага.
Карону на сваей галаве мець — павышэньне, паважаньне ад іншых, адзнака, пашана.
Карову даіць — даход, добра.
Карчма — адпачынак.
Каралі чырвоныя — радасьць, белыя — задаваленьне, чорныя — смутак.
Карусель, на ей праехацца — ашукаеш сам сябе.
Каўнярок цесны надзець — клопаты нездаваленьне.
Каханага сьніць — хуткае спатканьне.
Кілбасы есьці — радасьць, госьці.
Кірмаш — быць у кумпаніі.
Кійком падпірацца — атрымаеш падмогу.
Клінам разшчапіць плашку — закончыцца клопат.
Клясьці каго — пагодзішся.
Ключ трымаць у руках — будзіш усім кіраваць і аба ўсім ведаць; безработным — служба.
Клапаціцца аб чым — добра закончыш працу, за якую ўзяўся.
Котка — прыкрасьць праз здраду.
Крапіву есьці — добра; калі хвораму яна сьніцца, няхай згатуё, як шчаўлю і зьесьць, бо можа гэтага патрабуе арганізм.
Крапівай сьцябаць сябе — зробіш тое, аб што будзеш шкадаваць.
Крыж цалаваць — пасьля прыкрасьці дабрата.
Крыж цяжкі несьці на сабе — будзь цярплівы;

чакае на цябе горшае жыцьцё.

Кросны новыя — перамена жыцьця, для паненак замужжа.

Кросны старыя не паламаныя — добра: у жыцьці тваім настане лад і парадак.

Курсы — клопат але ўдаход.

Купацца ў чыстай вадзе — удача, радасьць.

Купацца ў мутнай, балотнай вадзе — няўдача, смутак.

Кудзелю мяць у руках — карыснае добрае знаёмства з чалавекам мягкага характару.

## Л

Ладную дзяўчыну цалаваць — спаткаешся с фальшам.

Лазіць па узгорках — клопаты, якія абернуцца на тваю карысьць.

Лазьня, мыцца ў ёй — абновіцца жыцьцё.

Ламаць венік — разаб'еш еднасьць.

Лапці замест ботаў мець на нагах — абядненьне праз кражу.

Латаць пальчаткі (ісподкі) — займешся карыснаю працай.

Літары складаць (сьлябізаваць) — карысьць атрымаеш с пачатае працы.

Лісьцё пажоўклае старае — смутак.

Лісьцё зялёнае, маладое — здароўе, радасьць.

Лічыць (аблічаць) жывёлу — страта ў гаспадарцы.

Лізаць міскі, ці талеркі — стыд праз лішнюю тваю гаворку.

Лізаць руку каму— паддасіся пад нейчый уплыў (кіраўніцтва).

Ліпавы цьвет сабіраць — празябнеш; каліж ужо хварэеш прастудна—выпі гарбаты з ліпавага цьвету (арганізм відочна гэтага дапамінаецца.)

Лом — прыгатаваны будзь да цяжкай працы.
Лодкай ехаць па ціхай вадзе — добра, жыцьцё спакойнае, шчасьлівае.
Лодкай ехаць бурлівай пагодай па хвалях — небасьпека, трывожнае жыцьцё.
Лудзіць самавар — знаходка, спадак, выйгрыш.
Лунаціка нерастрашыць — мядзьвежую ўслугу зробіш камусь.
Лыкі драць — даведаешься шмат аб чым.
Ляцець у паветры далоў (уніз) няўдача цябе чакае, ляцець уверх—радасьць, пашана, удача.
Лякарства піць — хвораму здаровье, здароваму хваравітасьць.
Ляпу ваўка аглядаць—трывога, стыкнешся з ворагам.
Лярву абнімаць — небасьпечнае знаёмства.

## М.

Маёўку спраўляць — быць у вясёлай кумпаньні.
Маліны — радасная навіна, спатканьне.
Маліцца — пацешышся.
Малоць — даход у хату.
Малако піць — здароўе, прыбыль.
Манэта залатая — павага, слава, багацьце; сярэбраная — задаваленьне з перамен, ці з падарожжы; медзяная—удача ў каханьні.
Маніць — благую працу пачнеш.
Мароз трашчыць— прыкрая навіна.
Махаць (пагражаць) рукой — будзеш сварыцца.
Маўчаць — не прагаварыся наяву.
Махорку курыць — сон ня мае вагі.
Медаль — адзначышся.
Месяц у поўні — ўдача ў задуманым; чверць месяца (квадра 1—4) ня зусім добрае значэньне.
Мясьці хату — чакай гасьцей.
Мёд — хвораму здароўе; здароваму прыбыль.

Мерыць зямлю аршынам — хаўтуры сажнем — зямельная справа, купля ці прадажа.
Мірыцца (згода) — пацешышся.
Міргаць вачыма — няўдача.
Мілага сьніць — хуткае спатканьне.
Мніх (Законнік) — адзіноцтва, спакой.
Мокрым быць — прыкрасьць.
Морква — здароўе.
Муха ўкусіла — хатняя сварка.
Мурашку бачыць — дастанеш працу.
Мыла — прыглядзі за чыстатой цела, каб не абсыпалі болькі.
Мядункі сабіраць — удача ў каханьні.
Мякіну есьці — недастататкі.
Мятла — пагроза, сварка.
Мяхі пустыя — няўраджай, няўдача; поўныя збожжа — багацьце.
Мясіць цеста — думкі споўняцца.
Мяса — хвароба.
Мярлог чысьціць — бач, каб не захварэла жывёла.
Мяцеліца — нядоўгі клопат.

## Н

Нагінацца перад кім — страціш ласку.
Надсьмехацца — над табой сьмяюцца.
Надламіць палец — захварэе блізкі родны.
Нажыцца (пабагацець) — сон гэты ня мае вялікае значэньня.
Нажы і відэльцы чысьціць — вясельле, шмат гасьцей.
Налесьнікі — памыснасьць, дружба.
Нанімацца на службу — падпадзеш пад чужую волю.
Нанімаць кватэру — перамена.
Напіцца крынічнае вады — здароўе, адраджэньне; чырвонае крыві — крыўдзіш кагось непамерна; бузяністае вады — хвароба, непамыснае жыцьцё

Наругацца — сварка.
Наручнікі-кандалы бачыць — пачуеш аб няшчасьці, самому іх насіць — вялікі смутак.
Насоўку ў крыві — сьцеражыся скандалістаў-бітуноў.
Настойку вішнёвую піць — пацешышся сумесна з блізкімі.
Находка (знаходка) — добра.
Начыньне (пасуду) чысьціць — перамена, госьці.
Нітка белая — блізкая вясёлая падарожжа; чорная — блізкая смутная падарожжа.
Ніц ляжаць — будзеш скрыўджаны.
Ногі страціць — пажар, зладзейства, цяжкая хвароба (калі ногі твае былі моцна чым націсьнуты пад час сну, сон ня мае ніякага значэньня).
Новы будынак аглядаць — перамена; будаваць — будзе нябошчык.
Нос даўгім зрабіўся — запасіся царплівасьцю, будзе добра.
Нэрвовым быць — непамыснасьць.
Няпрыяцеля бачыць прыгатоўся да згоды.
Нябошчык — трывога, непрыемнасьць.
Нясьці каго на плячох — той патрабуе тваей падмогі.
Нюхаць зямлю — збліжэньне сьмерці.

## П

Павук — хітрасьць, небасьпека.
Пакульлем запіхваць вокны, ці дзверы — будзе сьцюдзёна.
Паліцыя — здарэньне, неспакой.
Палена — малазначная падмога.
Пальцам хто на цябе паказуе і страх цябе агарне — сьцеражыся нападаў, ці арэшту.
Палёгка ў дыханьні — палёгка ў жыцьці.
Пампушкі пшонныя — быць у гасьцёх.

Папяросы курыць — пусты сон.
Парасё рэзаць — перамена.
Пердону прасіць — будзеш вінаваты.
Паркалёвую новую кашулю, ці сукенку апрануць — прыемная навіна.
Парог высокі — перашкода.
Пекла, у ім быць — нячыстае сумленьне.
Пірог есьці — будзеш пацешаны.
Пілігрымам быць — падарожжа, адзіноцтва.
Пісьмо атрымаць — навіна смутная ці вясёлая залежна ад калёру канвэрта ці зьместу.
Плот гарадзіць — дзяліцьба.
Плуг правіць — карысная праца чакае.
Плюваць на каго — крыўда; на сябе — зьвярні ўвагу на свае абмылкі.
Плясьці лапці — працай палепшыш жыцьцё.
Плясьці кошыкі — даход будзе.
Пожні незнаёмыя абглядаць — арэнда, спашка, пераезд.
Пуга — кара.
Пугаю біць каго — госьць.
Перо птушынае пры шапцы — сон неважны.
Пярун пачуць — надзвычайная навіна.
Пялёнкі — хрэсьбіны.
Пякотка — хваравітасьць.
Пуня пустая — беднасьць, смутак; поўная корму — багацтва.
Пужацца каго — будзь асьцярожны.
Пьяным быць — вясёлая навіна.

## Р

Рагожай накрыцца — недастатак.
Рак — перамена ў працы.
Раненым сябе бачыць — крыўда ад блізкіх.
Рака з вадой чыстаю — добра; з мутнаю бузяністаю — дрэнна.
Радасьць адчуваць — пацешышся.

Радавацца надмерна — смутак.
Раніць (пабіць) каго — крыўда; да крыві — крыўда роднаму.
Рапуха — няпрыемнае спатканьне.
Рэвізія — помні аб дарозе праўды (сон асьцерагае).
Ратунку праз сон крычаць — сон нямае вялікае вагі.
Рэлігійным быць — у смутку пацешыцся.
Рабёнка вясёлага бачыць — радасная навіна; плачлівага — смутная.
Роднага нябошчыка бачыць — чакай важнага здарэньня.
Рогі — небасьпека.
Ругацца — прыкрасьць.
Рупіцца (гарачыцца)—памыснасьць, удача.
Рукаў кашулі адарваны — хваравітасьць, страта.
Рукаў пальта — таксама ўбытак паважнейшы.
Рушнік белы — доўгая падарожжа, цёмна-брудны — няўдалая падарожжа.
Руіны замчышча, або старага будынку — спатканьне з даўнейшым знаёмым, або гутарка аб прошлым.
Ручаёк глыбокі празрысты — шчасьце; няглыбокі — ні дрэнна, ні добра.
Руганіну чуць — прыкрыя навіны.
Рыба — пакорнасьць, згода.
Рэзаць жывёлу — канец клопату.
Рэпу есьці — здароўе.
Рэкорд пабіць — адзначэньне.

## С

Саха — праца, надзейся на лепшае.
Сажай абмазаны твар свой — цябе чэрняць, абгаварываюць.
Самаход — госьці.
Самату ў самаход сесьці — падарожжа.

Самалёт — неспадзеваная навіна.
Садок пры ясным надворьі — прыемнае задаваленнае жыцьцё.
Сароміцца — абмылішся ў нечым.
Самавар — госьці, прыяцелі.
Салома паліцца — нядоўгі мароз; летам — засуха, пякота.
Сварыцца — нязгода, суд.
Сірата — спачувай блізкому ў бядзе і недастатках.
Скрыгаць зубамі — непамыснасьць.
Слуп агнявы бачыць і яму дзівіцца — назвычайная навіна.
Славіць Бога — пацешышся ў смутку.
Смутным быць — развесялішся (але зьвярні ўвагу сваё здароўе).
Стол на тонкіх ножках — жыцьцё ня зусім памыснае.
Стол з тоўстымі ножкамі — памыснае жыцьцё.
Ступенькамі падымацца ўгару —памысные справы.
Ступенькамі апушчацца ніжэй — няўдачы.
Судзьдзя — сьцеражыся хвальшы ў сваіх паступках.
Суліць грошы каму — непатрэбна страцішся.
Сухое дрэва — хваравітасьць, або і хаўтуры ў блізкіх.
Суфлёрам быць — цябе падслухаюць.
Сьмех ціхі пачуць — хітрасьць.
Сьмех іронічны (насьмешка)—абгавор.
Сьляпым быць — абмылішся.
Сьвіньню адну бачыць — абгавор; сьвіньню з парасятамі — даход, знаходка, выйгрыш.
Сьмелым быць — удача ў інтэрэсах, ідзі па намечанай дарозе.
Сьляпога вадзіць — паслухмяннасьць і ўдзячнасьць.
Сьмяротнага бачыць — твой блізкі хварэе, а табо непамыснасьць.

Сьмерць з касой — небасьпека.
Сьмятану зьбіраць — прыбытак, добры знак.
Сьвякроў бачыць плачучы — радасьць, сьмяючыся — смутак (сон гэты ня ўсім аднолькава праўдзіць).

Сьцерагчыся вужакі — небасьцека з боку хітрага і шкадлівага чалавека.

Сьцерагчыся ката — здрадлівасьць.
Сьцерагчыся сабакі — будзешь мець дачыненьня з ворагам, якога можаш з рабіць найшырэйшага прыяцеля.

Сямью кінуць — перамена прыкрасьць.
Сяліба старая — нічога асаблівага, новая — перамена.

Сякера — помач, праца, сякера ўкрыві — небяспека.
Сядзець над прорвай (пропасьцю) небасьпека, будзь асьцярожны.

## Т

Табаку (лісьцё) крышыць — сон ня важны, падгатоўчага значэньня.

Талерка пустая недастатак; поўная стравы — добра.

Танцы — радасьць пацеха.
Тапіцца — няўдача, небасьпека.
Тарапіцца (рупіцца) — хуткае заканчэньне справы.
Таргоўлю залажыць — ажывіцца жыцьцё, перамена к лепшаму.

Таракан — абманчывая трывога.
Тату нябошчыка бачыць, калі сьмяецца — на шчасьце; калі ў смутку — на няўдачу, клопаты.

Турчака пачуць — малаважныя навіны.
Тэатр пусты — смутак, адзіноцтва.
Тэатр поўны людзей — задаваленьне.

## У

Ударыць каго да крыві — прыб'ецца родны; бяз крыві — чужак ці знаёмы.
Удавіцца — няўдача (калі шыя чымсь была моцна націснута пад час сну, тады сон ня важны).
Удушлівым стацца — хвароба (калі не занадта быў накрыты сплючы).
Узьляцець высока — шчасьлівая перамена.
Укалоцца ружай — непамыснасьць у каханьні.
Укалоцца калючым дротам, іголкай, нажычкамі і т. п. — непамыснасьці ў працы штодзённага жыцьця.
Уваліцца ў студню — непамыснасьць, смутак, няўдача.
Умову рабіць (дакумэнт) — заканчэньне клопату, перамена.
Утапіцца — перамена на горшае.
Ухапіцца за брытву — паважная небасьпека.
Ухварбаваным быць на чорна — непамыснасьці, смутак.
Ухварбоўка на сьветла-вясёлыя калёры — радасьць, добра.
Учаднець — неспадзеваная небасьпека.

## Ф

Фабрыка з дымам — даход, праца, дабрабыт; бяз дыму — безпрацоўе, беднасьць.
Фальшывага чалавека ў хату прыняць — будзеш ашуканым.
Фасоль белая — добра; шэрая — таксабе.
Флірт — знаёмасьць.
Фурманом быць паедзеш.
Фурманку нанімаць — сабярыса ў падарожжу.
Філіжанку пабітую (чарапкі) — няўдача.
Філіжанка цэлая, напоўненая піцьцём — надта добрае эначэньне, памыснасьць.

## Х

Хавацца — прычэпіцца нялюбы чалавек.
Хадзіць па балоце — непамыснасьць, па чыстай вадзе — радасьць.
Хаваць грошы — бач каб цябе не абкралі.
Халаднік есьці — заспакаеньне добра.
Халявы шырокія ў сваіх ботах — багацтва.
Хамут на сябе ўскладаць — бяда, трывога, клопат; хамут узьдзець на каня — падарожжа.
Характар зьмяніць — жанімства, або цяжкая хвароба,
Харчы мець у руках — прыгатоўся ў падарожжу.
Хату новую будаваць — маладым радасьць, старым людзям — збліжэньне сьмерці.
Хаўтуры — няпрыемнасьць.
Хаўтурныя песьні чуць, або пяць — смутак, страты блізкіх родных або знаёмых.
Хварэць — сьцеражыся каб не захварэў праўдзіва.
Хвост чый мець у руках — стыд, назадавальнасць, крыўда).
Хваліцца — страціш на сваей славе.
Хваліць Бога — вялікае неспадзеванае шчасьця.
Хванабэрыстым быць — пакарышся перад ніжэйшым, або бяднейшым ад цябе.
Хварбай чорнай абмазацца — смутак; чырвонай— радасьць; болай выйграеш на судзе (калі судзішся), нявіннасьць, пацеха.
Хвігуру гіпсовую абнімаць — маеш хвальшывага таварыша; цалаваць хвігуру — будзеш ашуканым.
Хвігу даць — заслужаная непрыемнасьць.
Хвораст збіраць і паліць — перамена пагоды к лепшаму, а таксама палепшаньне адносінаў хатніх.
Хіляцца на бакі — няўдача, аслабленьне.
Хлеб масіць — прыгатоўся к добрай навіне.

Хлеба булку мець у руцэ — прыбыль у гаспадарцы.
Хлеў чысьціць (гной вывазіць) — хаўтуры ў радні, або знаёмых.
Хлібаць тарапліва страву — праз зайздрасьць сабе пашкодзіш.
Хмуру цёмную бачыць — неспакой, клопат; хмуры сьветлыя — напрасная трывога.
Хрэн есьці — паздаравееш.
Хрыпка — цяжкія клапатлівыя справы.
Худым быць — жыцьцё пагоршае.
Хусткай цёплай абкрываццa — перамена к лепшаму, дастатак.
Хустку парваную абглядаць — прыкрыя плёткі, недастатак.

## Ц

Цалавацца з жывым чалавекам — задаваленьне, згода; з нябошчыкам — чакай емутку.
Цёмны пакой, у ім быць — гразіць арышт, наагул нешта благое.
Цела сваё голым бачыць — стыд; чужое — пачуеш нешта стыдлівае аб суседу (у рэдкіх выпадках гэткі сон асьцерагае перад зладзеямі і пажарам).
Ціснуцпа праз натоўп — адзначышся.
Ціснуцца праз вузкія дзьверы — важная перашкода.
Цікавіцца на цягнік — госьці.
Цукер, цукеркі есьці — каханьне дружба.
Цыганы — хітрасьць, будзь асцярожны з чужынцам.
Цыбулю чысьціць — кароткі смутак; цыбулю есьці — ажывішся і паправішся (калі хворы).
Цымбалы падстраіваць — наладзіцца жыцьцё; пачуць іграньне на цымбалах — прыемная навіна.

Цыліндар на галаве мець — пашана, высокі чын.
Цыкорыю есьці — дрэннае жыццё; сварка ў сямье.
Цьвякі заганяць у сьцяну — патрэбныя выдаткі.
Цьвятучае дрэва — дужа добра, дадатный рэзультат тваей працы.
Цэпам біць каго — чужак прыб'ецца, біць каго да крыві — чакай роднага.
Цэглы купляць — пабагацееш.
Цэп навязваць — выпаўняцца твае надзеі, але ня хутка.
Цэліцца з аружжа — заахвоцішся да аднаго інтэрэсу, але выцаўненьня будзе залежаць ад твайго спрыту.
Цялушку гладзіць — карысьць прыбыль у гаспадарцы.
Цяплёнка (курчонка) рэзаць — непажаданыя госьці або хвароба.
Цягнік, бачучы на рэльсах — ад цябе твой ад'едзе з дому; цагнік збліжаецца да цябе — чакай гасьцей або навінаў.
Цягнуць воз самаму — страціш каня.
Цяністае дрэва — добра: інтэтэсы пайдуць па думцы тваей; абадранае сухое дрэва — смутак няўдача.
Цярністаю расьлінкаю абкалоцца — спаткаешся з перашкодамі і ушчыплівасьцю.
Цярпець прыкрасьць — пацешышся пасьля клопату.
Цякучы ручаёк бачыць — часткова споўняцца твае замыслы.
Цепліць печку — пацешышся, нанова зажывеш (маладым пачатак каханьня).
Цягнуць ваду са студні новым вядром — значэньне добрае; старым пашчапаным — няўдачы ў якіх сам вінаваты будзеш.

## Ч

Часаць валасы — госьці, бараду — прыбыль, дастатак.

Чапец чорны на галаве — смутак.

Чарніла разьліць — зробіш прыкрую абмылку.

Чарніць — сьлёзы.

Чарпак (што чэрпаць ваду) без вады — недастатак, убытак жывёлы, з вадой чарпак — прыбыль у гаспадарцы.

Чараны ад нажа ці ад відэльцаў — страта.

Чаравікі надзець старыя — пойдзеш у знаёмаю дарогу, новыя чаравікі — незнаёмая падарожжа.

Чараўніка бачыць — асьцярагайся злога суседа; гаварыць з чараўніком ветліва — добрае значэньне; ругацца — вялікая перашкода ў інтэрэсах.

Чарвівае яблыка трымаць — перасьцярога перад ашуканствам ці таемнай хваробай.

Чакаць кары — папраў сваё суменьне.

Чарадой стаяць за хлебам — будзе недахват у ядзе; за сенам — ня хопіць корму дзеля жывёлы.

Чарку пустую трымаць — няўдача, разаб'ецца інтэрас, які ўжо пачаў; чарку поўную гарэлкі — удачлівае выпаўненьне думкі.

Чарапкі ад гаршка глінянага бачыць — будзеш на хаўтурах.

Чаромхі кветкі нюхаць—пуыемнасьць, ажыўленьне.

Чарэшні есьці — клопат, неспакойнасьць.

Чорта — небасьпека; цалавацца з ім — рызыкоўны інтэрас.

Чурарацца — забясьпечышся ад непатрэбных клопатаў.

Чурацца свайго — будзеш стратны праз абмылку.

Чыноўнік (урадовец) прыўдзе да цябе ў чорнай вопраўцы з партфэлем — чакай выдатку; ён

жа ў сьветлай вопратцы — радасная навіна або спадак.

Чырвонае яйко — прыемная навіна.
Чырванець — цябе будуць стыдзіць.
Чырыканьне салаўя — каханьне; іншых прастых птушак — навіны.
Чытаць псальмы — у смутку цябе нехта пацешыць.
Чытаць газэціну — навіна.
Чыстую ваду бачыць — дужа добра, удачлівае выпаўненьне пляну.
Чысьціць пасуду (начыньне) — чакай госьця.
Чысьціць вопратку — зьбірайся сам у госьці.
Чыхаць — добрая неспадзеваная навіна.
Чыніць боты ці вопратку—рыхтуйся ў падарожжу.
Чырвоныя воблакі на небе — радасьць у каханьні.
Чыгункаю ехаць — хуткая перамена.

## Ш

Шабляй махаць — небасьпека, сварка.
Шалёны сабака — небасьпека ад свайго чалавека; біць шалёнага сабаку — прыб'ецца непажаданая асоба.
Шапка на галаве — блізкая падарожжа.
Шаптацца с кім — пачуеш сэкрэтную навіну.
Шаранчу на сваім полі ці ґародзе — страты, злы ўраджай.
Шафа поўная — добра, пустая — беднасьць.
Шкляныя грошы мець — будзеш ашуканым.
Шмараваць тлустасьцяй боты — перамена пагоды на макрату.
Шнуроўку апранаць — перамена к лепшаму, зьнімаць с плеч яе — к горшаму.
Шнуром зачапіць рыбіну — даход.
Шпіталь, у ім быць — падмога.
Шпількаю ўкалоцца — малая прыкрасьць праз кабету.

Штурхацца — спаткаешся з непрыемнасьцяй.
Шустрым стацца — палепшацца варункі жыцьця.
Шыю сваю пахудзеўшую ўбачыць — папрацуеш паважна галавой.

## Э

Эгоістым (самалюбам) быць — нездавольства, пусткі ў сёрцы, адзіноцтва.

Элэктрычнасьцю сьвяціць у цемры — прынясеш вялікую карысьць сваей працай.

## Ю

Юшку рыбную хлібаць — беднасьць, недастаткі; юшку з клёцкамі ды рыбай есьці — ўдача, дужа добрае значэньне.

Юду апостола бачыць або з ім гаварыць — спадзявайся ашуканства і няшчырасьці ад блізкага табе чалавека.

## Я

Яблыка здаровае есьці — здаволены будзеш з сваіх справаў; чарвівае — абмылішся ў сваіх надзеях, а мо нат крышку пахварэеш.

Яблыньку садзіць — павялічыцца твая маемасьць; вырваць з зямлі сваімі рукамі — страты з тваей віны.

Яблынька багата цьвітучая — добра; сухая бязлістная — дрэннае значеньне, недахоп грошаў, беднота, з якой мусім змагацца.

Ягады чорныя — смутак, непамыснасць, сьлёзы; чырвоныя — вясёласьць.

Ягнёнка зарэзаць — пазбавішся добрага прыяцеля праз сваю жорсткасьць.

Ядомінай запасацца — падарожжа, або асьцярога перад галадоўкай.

Ялоўцавы (ядленцавы) ягады есьці — хвораму выздараўленьне, здароваму перасьцярога.

Яма, у яе ўваліцца — паважная няўдача.

Ямку на дрэва падгатовіць — радасьць, ўдача.

Яндоўку спаліць — пабеднеешш праз неўраджай, або які выпадак.

Яндоўку мыць і стаўляць у сьвіран — здаволеньне з багатай восені.

Яшчарку гладзіць — за рызыкоўнае дзела учэпішся.

Яшчарка — малы неспадзяваны клопат, а нават страх.

# Хіромантыя

або

## як пазнаць з рукі характар, здольнасьці, прошлае і прышлае кожнага чалавека.

Кожны чалавек мае на сваіх далонях шмат тонкіх і грубейшых ліній. Навукаю і практыкаю сцверджана, што гэтыя лініі—гэта Гараскоп (плян) жыцьця ад нарадзінаў да самае сьмерці.

Па лініях далоні добры хірамант лёгка і зусім праўдзіва прароча кожнаму чалавеку яго будучыню, хваробы, здароўе, шчасьце, няшчасьця, дарогі і перамены, бедната і багацьце—усё гэта наперад прадугледжана няведамай нам Вышняю сілай,

Неразумна талкуюць некаторыя духоўнікі і некаторыя цёмныя людзі, што хіраманты—гэта забабон, што хірамант ёсьць небясьпечным для рэлігіі

Навука заўсёды будзе навукай. Хіраманты ня толькі йдзе побач з праўдзіваю чыстаю рэлігіяй душы, але яшчэ глыбей абасноўвае пачуцьцё нечага Вышэйшага.

Хірамантыя адчувае вялікую лёгічнасьць вялікі Розум і Плян у ваўсім жыцьці ўсяго жывога.

Цесна і ўсебакова зьвязаны мы,—людзі, ня толькі са сваімі семьямі, але і з людзьмі далёкімі.

Прыкладаў таму тысячы. Барыс Ковэрда і Войков радзіліся ў розных гадох, расьлі ў адменных варунках жыцьця, а на сваіх руках насілі адмалку знакі: на такі-то год сьмерць Войкова, а пералом у судзьбе Ковэрды. (У літэрах іхных прозьвішчаў знаходзіцца прадугледжаная судзьбамі трагедыя)—

Хірамантык даказвае, што ня толькі дзень нарадзінаў абуслоўлівае нашу долю, але доля гэта прадугледжана наўперад вышняю Боскаю Сілай і чалавек атрымлівае гэтакія, а ня іншыя варункі жыцьця задоўга да сваіх нарадзінаў.

З гэтага відаць, што жыцьцё нашае ёсьць не абы што, а самае паважная зьява на сьвеце.

## Аб пальцах.

Кожная рука мае пяць пальцаў. Выгляд іхны іграе не малую ролю ў характарыстыцы чалавека.

Найбольш важным ёсьць вялікі палец.

Рысунакі 1, 2, 3, 4 паказваюць, якую форму мае гэты палец у розных людзей.

Рыс. 1. Вялікі, тоўсты сустаў (ногцявы) пальца бывае ў людзей моцнага характара, сільнае волі, рашымасьці, асабліва калі, яшчэ да гэтага палец ёсьць цьвёрдым.

На рыс. 2 дзе даўжэйшым будзе другі сустаў, паказана слабая воля, мягкі характар, але добры розум і лёгіка.

Рыс. 3 паказвае сярэдняе сілы волю і розум. Палец гэткі бывае ў людзей умеркана-спакойнага характару.

На рыс. 4 нарысаваны ёсьць тоўсты кароткі, з ногцем кругла-кароткім палец— чалавек гэткі ёсьць тупаваты і упёрлівы.

**Значэньне даўжыні пальцавых суставаў.**

Кожны палец мае тры суставы: першы (з нагцём), другі сярэдні, трэці лучыцца з далоньню.

У залежнасьці ад таго, які з суставаў даўжэйшы, такую характарыстыку дадзём чалавеку, прыклад:

На рыс. 5 даўжэйшымі ёсьць трэція суставы (зачырканые). Чалавек гэткі будзе адзначацца любоўю да добрай яды, выпіўкі усякіх цялесна прыемных пражываньняў.

Гэта чалавек сьвецкі.

На рыс. 6 паказаны даўгімі другія суставы пальцаў—Чалавек спэцыальны, любіць рамясло, працу і ў тэтым добра камбінуе галавой.

На рыс. 7 суставы першыя (нагцёвыя) лічуцца доўгімі—Чалавек любіць рухлівасьць, рупнасьць, духоўнасьць, плянаваньне і мышленьне.

Цяпер колькі словаў:

**Аб выглядзе пальцаў.**

На рысунках 8, 9, 10, 11, 12 паказана, як дзіўнае формы бываюць пальцы: вострыя, чатырохгранныя, лапатковыя...

Пальцы гладкія (р. 8 і 10.)—бязклопатны чалавек, спрытны, жывы ў мысьлях.

Пальцы вузлаватыя (р. 9) бываюць у людзей практыкі, старых, бывалых і мысьлячых.

Рыс. 11—прадстаўляе пальцы добрага служакі і законнага чалавека (фармаліст).

На рыс. 12—пальцы чалавека ўдалага ў мэханіцы, тэхніцы і наагул чалавека, рухлівага, энэргічнага, практычнага.

## Аб узгорках на далоні.



Уважна прыглядаючыся да далоні мы прымецім, што над кожным пальцам ёсьць больш-менш выдатныя прыпухласьці-узгоркі.

Не на ўсякай руцэ іх можна бачыць. Імі абуслоўлены такія ці гэткія здольнасьці чавека.

На рыс. 13 пад № 1 паказан узгорак Вэнэры, плянэты, сымболізуючай каханьня, прыгожасьць, дабрахотнасьць.

Пад № 2 бачым мы ўзгорак Юпітэра. Разьвітасьць гэтага ўзгорка сьведчыць аб больш-ным ці меншым эгоізме, самапачуцьці, амбіцыі і г. д.

Пад № 3 маем мы ўзгорак Сатурна— здольнасьці да спраў зямельных, судзебных, інжынерскіх.

Узгорак № 4 прыпісваецца Сонцу і характэрызуе сабой здольнасьці да музыкі, малярства, акторства, і іншых спэцыяльнасьцяў злучаных з добрым густам і штукарствам

Узгорак 5 абрысоўвае сабой здольнасьці да навукі, мэдыцыны, гандлю і завецца ўзгоркам Мэркурага.

Пад 6 ёсьць паказан ўзгор. Марса, планэты, абазначаючы сабою адвагу, сьмеласьць, трыванье, або адваротныя таму здольнасьці (калі ўзгорак праваліўшыся).

Далей пад 7 бачым ўзгор. Месяца.

Характэрызуе ён настрой душы чалавека, нэрвовасьць, спакойнасьць, гарачнасьць або меланхолію, рэлігійнае пачуцьцё або няверу.

Трэ быць надта спэцыальным каб без абмылкі на аснове выдатнасьці (пухласьці) узгоркаў паведаць аб здольнасьці і характары чалавека.

Добра аб чалавеку сьведчаць нармальныя узгоркі —дрэнная харктэрыстыка будзе тады, калі ўзгоракі занадта высокі, або зусім не падымаюцца над паверхняй далоняў.

## Аб лініях, з якіх чытаецца лёс чалавека.

Хіраманты разьлічаюць на руцэ ў звычайнага чалавека тры галоўных лініі (рыс. 14) жыцьця (1), галавы (2), сэрца (3).

У людзей нэрвовых, больш вучоных, шмат перажываючых, бываюць на руцэ яшчэ лініі долі (6), спэцыяльнасьці (5), здольнасьцяў да навук і гандлю (4).

Колер, і глыбіня, шырыня, даўжыня ліній і ўзьемная іхняя сувязь маюць аграмаднае значэньне для хірамантa—шмат аб чым яны яму гавораць!

Глыбокая, шырокая, добра абфарбованая лінія абазначае здароўе, энэргію, вясёласьць і жывасьць.

Лініі бледна-тонкія, паперарываныя даказуюць недахоп сокаў жыцьцёвых, малакроўе, хваробы, сумны настрой і нездаволеннасьць з жыцьця.

Лінія, маючая афарбоўку цёмна-жоўтую, або сінюю сьведчыць аб цяжкіх думках, злосьці, зачэпнасьці.*)

*) Падрабязнае апісаньне значэньня кожнае лініі знойдзе чытач у спэцыальным падручніку хірамантыі. А. Васілеўскага (па польску).

# Астролёгія.

Астролёгія — матка цяперашняй астраномії ёсьць навука, якая дарогаю аблічэньняў на кожны мамэнт мейсца распалаженьня плянэтаў можа прадугадаць наперад усякае здарэньне і усякія перамены ці то ў жыцьці аднае асобы, ці то цэлага гаспадарства. Аблічэньне гэтае завецца Астролёгічным гараскопам.

Даўней надта цанілі астролёгаў: каралі трымалі іх пры сабе і атрымлівалі парады перад усякаю важнаю пераменаю ці пачынаньнямі.

Нараджаўся чалавек — астралёг стаяў с папірусам у аднэй, а з гусіны пяром у другой руцэ — гатовы, чакаючы мамэнта народзінаў; тады спраўджаў распалажэньне плянетаў у небе на данную мінуту і камбінаваў гараскоп.

Па некалькіх днях працы і ня лёгкіх абліченьнях ён павядамляў бацькоў аб долі нованароджанага.

Гараскоп можна стаўляць (аблічыць) на пачатак інтэрэсаў, жанімства, вайны і г. п.

Вось прыклад з недаўнае мінуўшчыны:

Ангельцы канчалі будаваньне аграмаднага парахада-карабля „Tytanik'a".

У мамэнт спушчаньня на ваду гэтага „Tytana“ аблічылі астралёгічны гараскоп.

Гараскоп прарочыў караблю няшчасьце і пагібель праз кароткі час.

Быў вызначаны і прадугледжаны нат‘ дзень пягібелі і што-ж? Усім у памяці павінен быць той факт, як падчас нядаўняе вайны „Tytanik“ шыбка сунучыся морам, (вязучы блізка дзьве тысячы пасажыраў), раптоўна ударыўся носам аб лядзяную гару, плаваючаю па мору і праз паўгадзіны затануў!

Шмат тады людзей згінула!

Прароцтва астралёга спраўдзілася. Астралёгічная літаратура мае аднатаваных сотні фактаў, падобных апісанаму.

Шаснаццатае сталецьце аслабіла і зусім загнала ў падпольле астралёгію: лічучы астралёгаў, варажбітоў, хірамантаў і яснавідучых за людзей антырэлігійных, духоўнікі і сьвецкія людзі пачалі іх з усіх сілаў ціснуць, арыштоўваць мучыць а нат‘ паліць на вагнішчы.

Запанавала сіла над справядлівасьцю, цемната над навукаю.

Прайшлі дзесяткі і сотні гадоў цяжкіх і што-ж засталося пасьля астралёгіі — пэрлы навукі загінулі. Аматарам астралёгіі прыходзіцца цяпер з вялікім пакладам працы, разуму і цярплівасьці шукаць тое самае веды, тых самых пэрлаў каб іх ужыць на карысьць людзей.

## Плянэты.

Колькі тысяч гадоў таму халдэйскія і егіпецкія астралёгі заўважылі, што апрыч сонца і месяца па небу блудзяць (сунуцца з мейсца на мейсца) яшчэ іншыя плянэты.

Ня мелі тые астролёгі добрых тэлескопаў (падзорных трубаў) і не маглі углядзець усіх плянэтаў. Былі ім вядомымі Мэркур, Вэнэра, Марс, Юпітэр і Сатурн. Усяго разам з Сонцам і Месяцам сем плянэтаў.

(Пазьней, пры помачы тэлескопаў, астрономы знайшлі яшчэ дзьве плянэты: Урануса і Нэптуна. Гэтыя плянэты маюць менш уплыву на жыцьцё чалавека за тое, што знаходзяцца страшэнна далёка ад зямлі. Дзеля гэтага мы разам з даўнейшымі астролёгамі будзем мець наўвазе першых, бліжэйшых да зямлі, сем плянэтаў).

Дарогай векавых дасьледаў заўважана, што плянэты сунуцца па небу трымаючыся аднаго кірунку — з Заходу на Ўсход, і па аднэй і тэй самай паласе неба.

Паласу гэтую празвалі „дарогай плянэт“ або Зодыякам і гэты Зодыяк падзялілі (дзеля лягчэйшай арыентацыі) на 24 гадзіны (бо праз 24 гадзіны „дарога плянэтаў — Зодыяк“ поўнасьцю абарачываецца перад вачыма нагляднчыка).

Астралёгі дзялілі Зодыяк на дванаццаць роўных часьцін знакаў Зодыяка, апіраючыся на тым, што Сонца, быццам абходзіла ўвесь задыяк у працягу дванаццацёх месяцаў.

Кожны месяц або знак меў сваю назову, адпаведную да ўплываў яго на характар і выгляд чалавека.

І запраўду, вялікая розьніца ёсць паміж чалавекам народжаным напрыклад у студзені і народжаным у жніўні, і г. д.

Кожны, „знак зодыяка“ даваў і дае свой асабісты характар нованароджанаму чалавеку незалежна ад плянэт, якія сваімі заўсёгднымі перасуваньнямі давалі ў дадатку шчасьце або нешчасьце таму чалавеку сваімі магнітнымі ўплывамі.

## Распалажэньне знакаў Зодыяка на небе.

| № № знакаў | ЧАСЬЦЬ НЕБА, ДЗЕ СОНЦА БЫВАЕ: | Назоў знакаў Зодыяка |
|---|---|---|
| 1 | Ад 23 сакавіка да 22 красавіка | Баран |
| 2 | „ 23 красавіка „ 22 мая | Бык |
| 3 | „ 23 мая „ 22 чэрвеня | Блізьняты |
| 4 | „ 23 чэрвеня „ 22 ліпня | Рак |
| 5 | „ 23 ліпня „ 22 жніўня | Леў |
| 6 | „ 23 жніўня „ 22 верасьня | Паненка |
| 7 | „ 23 верасьня „ 22 кастрычн. | Вага |
| 8 | „ 23 кастрычн. „ 22 лістапада | Скорпіон |
| 9 | „ 23 лістапада „ 22 сьнежня | Стралец |
| 10 | „ 23 сьнежня „ 22 студня | Казёл |
| 11 | „ 23 студня „ 22 лютага | Вадалей |
| 12 | „ 23 лютага „ 22 сакавіка | Рыбы |

### Астролёгічны знак „барана“

Чалавек, які нарадзіўся ад 23 сакавіка да 22 красавіка мае характар жывы, гарачы, энэргічны, адважны і здольны да працы і арганізацыі. Трывалы, мае шмат жыццёвае сілы падчас капрызны.

Падупадаць будзе, на хваробы (болі) галавы; слабасьць вачэй

Астролёгія дае раду гэткім людзям менш есьці мяса і ня піць гарэлкі.

### Астролёгічны знак „Быка“

Чалавек, які нарадзіўся ад 23 красавіка да 22 мая бывае сільны, здаровы, упорлівы, пярэчлівы, скоры ў мысьлі, часта не абдуманы — адважны.

Да сыстэматычнае працы ня дужа надаецца. Здольны да навук. Лацьвей паддаецца хваробе горла.

Астролёгія дае раду гэтым людзям мець больш сыстэматычнасьці і трываласьці ў працы.

### Астролёгічны знак „Блізьнятаў.“

Хто нарадзіўся гэтай парой мае нявінны, добры, характар. Ахвотна памагае блізьнім. З людзей нараджоных ад 23 мая да 22 чэрвня бываюць добрыя калегі — таварышы. Воля слабая і яны лёгка паддаюцца чужым упывам і нагаворам.

Лацьвей паддаюцца хваробе лапатак, плячэй.

Астролёгія радзіць гэтым асобам не захоплівацца усякімі добрымі справамі і быць занадта шчырымі з кожным чужым.

### Астролёгічны знак „Рака."

Той, хто нарадзіўся паміж 23 чэрвіня і 22 Ліпня не адзначаецца надзвычайнымі здольнасьцямі. Лёгка адчуваюць прыхільнасьць або варожасьць да іх іншых людзей.

Даволі скрытны, самалюбівы недаверчывы, асьцярожны. Падпадаюць пад чужыя уплывы, лацьвей слухаюць чужой рады.

Здароўе маюць ня зусім добрае.

Адзначаюцца нецярплівасьцю пераменным характарам. Шмат маюць прыязьні але не да ўсяго. Гонаровы.

Павінны высьцерагацца людзей шкодных, агня і сухаты.

Паддаюцца хваробе рук найлягчэй.

### Астролёгічны знак „Льва".

Нараджоныя ад 23 Ліпня да 22 Жніўня маюць шмат супольнага ў характары сваім з характарам цара зьвяроў Льва.

Адважны, рызыкоўны, гонаровы, справядлівы, добрые арганізатары і пачынальнікі інтэрэсаў (гандловыя інтэресы ім не па характару).

Маюць арыгінальныя пагляды на жыцьцё.

Здароўе бывае ў іх добрае, калі не лічыць слабасьці сэрца.

Трэба ім высьцерагацца раптоўна-некарысных перамен лёсу і хваробы грудзей.

**Астролёгічны знак „Паненкі".**

Чалавек, які нарадзіўся ад 23 Жніўня да 22 Верасьня мае шмат добрага ў сваім характары. Прыгожы, не пярэчлівы, лацьвей уступае іншым у спрэчцы. Праз свой мягкі чыста «паненскі» характар часта падпадае пад уплывы і кіраўніцтва людзей больш хітрых і цьвердых. Мае добрае літасьцівае сэрца да ўсяго жывога.

Здольны да прароцтваў, праўдзівых сноў, прадчуваньня выпадкаў. Адзначаюцца рэлігійнасьцю.

Ня зусім верыць у свае сілы і праз гета (нягледзячы на ўсебаковыя здольнасьці) часта церпіць няўдачы.

Недастае ім сыстэматычнасьці і трываласьці ў працы і задуманых інтэрэсах.

Праўдзівы, шчыры але ня зусім слоўны.

Хварэюць найчасьцей жыватом і галавой.

**Астролёгічны знак „Вагі".**

Характар чалавека ўраджонага паміж 23 Верасьня і 22 Кастрычніка будзе больш-менш гэткі:

Справядлівасьць, роўнавага, здольнасьці да паэзіі, музыкі і навук. Да працы фізычнай— цяжкой не зусім надаюцца.

З людзей, нараджоных пад гэтым знакам шмат было знамянітых і выдатных вучоных, паэтаў, музыкаў.

Сіла волі і трываласьць умеркаваная.

Асьцерагацца павінна хваробы нэркаў, сярэдзіны (крыжа).

### Астролёгічны знак „Скорпіона".

Асобы, нараджоныя пад гэтым знакам (ад 23 Кастрычніка да 22 Лістапада) адзначаюцца неспакойным, рухлівым, энэргічным і троху ядавітым характарам.

Шмат агню і жыцьця маюць яны! Неспакойныя гэта людзі і пры сваіх немалых здольнасьцях часта бываюць у жыцьці важнымі асобамі і кіраўнікамі.

Людзі гэныя злучаюць у сабе яд з салодкасьцю, жыцьцёвасьць з пагібельлю і здрадлівасьцю.

Хваробы мужчынскіх і жаночых сэркрэтных часьцін цела.

### Астролёгічны знак „Стрэльца".

Людзі, народжаныя ад 23 Лістапада да 22 Сьнежня надта рухлівыя, энэргічныя, бегглы ў мысьлі і плянаваньны і спрытны. Хуткі да злосьці, хуткі да сьмеху. Здольнасьцяў не маюць праз недахоп рашымасьці і трываласьці, рэдка калі ўзвышаюцца над іншымі.

Любяць зьвяроў. Добрыя з іх ахвотнікі (паляўнічые).

Адна» з людзей народжаных пад знакам «Стрэльцаэ пападаюцца некаторыя моцна самалюбівы, нямілы, нежаласьлівы, чэрствага сэрца.

Пагражаюць хваробы бёдраў і рэўматызмы.

### Астролёгічны знак „Козерога".

(Ад 23 Сьнежня да 22 Студня). Характар упорлівы, самастойны, арыгінальны, цьвёрды, капрызны, праводзячы свой плян цярпліва да рэзультату. Працавіты і рухлівы, на яду не надта пераборлівы і можа быць здаволены малым.

Адзначаецца неуступчывым характарам, сьмеласьцю. Практычны ў жыцьці. У навуках ня зусім шчасьлівы.

Ня гледзячы на іхнюю рухлівасьць і жывасьць у іхным сэрцы часта гасьціць смутак і задума. Зайздросны. Любяць пачот і паважаньне.

Будуць пагражаць гэтым асобам хваробы: вывіхі, удары каленаў і рэўматызмы.

### Астролёгічны знак „Вадаліва".

Людзі, нараджоныя ад 23 Студня да 22 Лютага маюць здароўе найчасьцей добрае. На пагляд прыгожы, характару даволі добрага і прыязнага, але капрызнасьць аслабляе іхнюю добрую характарыстыку. Настрой жывы і пераменны.

Ня зусім трывалы ў працы і нат іншы раз лянівы.

Часта трацяць шмат часу і энэргіі на пустое і непатрэбна—лішняе.

Наагул, гэтыя людзі даволі загадковыя па свойму цэнныя для агульна людзкай сямьі.

Лацьвей паддаюцца хваробам ног, асаблі-ва лыдак.

### Астролёгічны знак „Рыб".

Чалавек, які нарадзіўся паміж 23 Лютага і 22 Сакавіка бывае здольны да самастойнае і кіраўнічае працы. Прыемныя гэта людзі і добрага сэрца. Яны ня проч памагчы блізкім. Шмат шчырасьці і рэлігійнага пачуцьця. Шмат маюць у сабе сымпатыі і жыцьцёвае сілы. Часта меняюць плян, энэргічны і рухлівы.

Недастатак іхны — гэта слабаватая воля і часта недаверра ў свае сілы.

Людзі, нараджоныя пад знакам «Рыб» наагул здольныя, і даволі шчасьлівы.

Асьцерагацца трэба ім прастуды і хваробы ступней.

# Шчасьлівыя дні і плянэты кожнаму:

| Знак Зодыяка | Хто радзіўся: | Найбольшы ўплыў плянэты | Шчасьлівы дзень: |
|---|---|---|---|
| Баран . . | ад 23 Сакав. да 2 Крас.<br>„ 3 Красав. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Марс<br>Сонца<br>Вэнэра | Аўторак<br>Нядзеля<br>Пятніца |
| Бык . . . | ад 23 Крас. да 2 Мая<br>„ 3 Мая „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Мэркур<br>Месяц<br>Сатурн | Серада<br>Панядзелак<br>Субота |
| Блізьняты | ад 23 Мая да 2 Чэрв.<br>„ 3 Чэрв. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Юпітр<br>Марс<br>Сонца | Чацьвер<br>Аўторак<br>Нядзеля |
| Рак. . . . | ад 23 Чэрв да 2 Ліпня<br>„ 3 Ліпня „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Вэнэра<br>Мэркур<br>Месяц | Пятніца<br>Серада<br>Панядзелак |
| Леў. . . . | ад 23 Ліп. да 2 Жніуня<br>„ 3 Жніу. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Сатурн<br>Юпітр<br>Марс | Субота<br>Чацьвер<br>Аўторак |
| Паненка . | ад 23 Жніуня да 2 Вер.<br>„ 3 Верасьн. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Сонца<br>Вэнэра<br>Мэркур | Нядзеля<br>Пятніца<br>Серада |
| Вага . . . | ад 23 Вер. да 2 Кастр.<br>„ 3 Кастр. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Месяц<br>Сатурн<br>Юпітр | Панядзелак<br>Субота<br>Чацьвер |
| Скорпіон. | ад 23 Кастр. да 2 Лістап.<br>„ 3 Лістап. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Марс<br>Сонца<br>Вэнэра | Аўторак<br>Нядзеля<br>Пятніца |
| Стралец . | ад 23 Лістап. да 2 Сьнеж.<br>„ 3 Сьнеж. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Мэркур<br>Месяц<br>Юпітр | Серада<br>Панядзелак<br>Чацьвер |
| Козерог . | ад 23 Сьнеж. да 2 Студ.<br>„ 3 Студз. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Юпітр<br>Марс<br>Сонца | Чацьвер<br>Аўторак<br>Нядзеля |
| Вадаліў . | ад 23 Студ. да 2 Лютага<br>„ 3 Лют. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Вэнэра<br>Мэркур<br>Месяц | Пятніца<br>Серада<br>Панядзелак |
| Рыбы. . . | ад 23 Лют. да 2 Сакавіка<br>„ 3 Сакав. „ 12 „<br>„ 13 „ „ 22 „ | Сатурн<br>Юпітр<br>Марс | Субота<br>Чацьвер<br>Аўторак |

## Што даюць нараджонаму планэты.

**Сонца** дае ахвоту да славы, багацтва, раскошнага прыемнага жыцьця, вясёласьці, гонаровасьці, справядлівасьці.

Дае здольнасці да мастацтва, пачуцьцё музыкі, паэзіі і г. п.

**Месяц** дае шчасьце у падарожах, частыя перамены і пераезды.

Людзі, нараджоныя пад уплывам месяца, бываюць росту высокага і поўнага ліца, здароўе ня зяўсёды добрае.

**Мэркур** дае здольнасьць да навук, гандлю, навук тайных, і да ўсяго таго дзе трэба спрыт мысьлі.

**Вэнэра** дае прыгожы выгляд, сымпатыю, удачу у справах каханьня, здольнасьці да паэзіі, музыкі, мастацтва.

**Марс** надзеляе новонараджонага шчасьцем у справах ваенных і, наагул, там, дзе патрэбна адвага, рызыка.

Удачліва гэтым асобам праца ці гандаль жалезам, крывёй, агнём і г. п.

**Юпітр** — плянэта чыноўнікаў. Дае справядлівасьць, законнасьць, гонаровасьць, шчырасьць.

Частыя павышэньні на службе і ўдачы.

**Сатурн** — надзеляе пад яго ўплывамі нараджоных павагай, мэлянхоліей, глыбінёй мысьлі і здольнасьцямі да спраў зямельных, інжынерных, судзейскіх і г. п.

# Людзкія прыметы.

Куры б'юца — к гасьцям; лётаюць па хаце — к марозу; на адней назе стаяць — к вiхуры (мяцеліцы); кудакчуць не ўпару — к нешчасьцю, не хаваюцца ад дажджу — дождж будзе доўга; калі куры ў ноччы зьлязаюць з курасадні — быць бядзе.

Кукушка кукуе на сухім дрэве — к марозу; лётае па вёсцы — к пажару.

Ластаўка саўе гняздо на будынку — шчасьце для гаспадара; лётае нізка пры зямлі — на дождж; лётае высока — к ветру і пагодзе; ластаўка раньняя — шчасьлівы год; ластаўка ўляціць у хату праз вакно — к нябошчыку.

Сабака выe морду да зямлі — к нябошчыку, носам угару — на пажар.

Ваўкі шукаюць яды блізка вёскі — на дарагоўлю і голад, выюць пры хатах — к марозу ці к вайне.

Галавешка с печкі вываліцца — будзе госьць.

Разьбіць нявольна люстэрка—нядобрая прымета.

Іскры с печкі — госьці.

С печкі вываліваецца цэгла — дрэнная прымета.

Ржуць коні — добра.

Лёд на рацэ становіцца грудамі — ураджай будзе.

Лес вясной тонець — цяжкі год.

Лоб сьвярбіць с правага боку — наклонішся мужчыне, з левага боку—паклонішся жанчыне.

За абедам вываліцца з рук лыжка — госьць будзе.

Зімой конь кладзецца (калі ня хворы) — к цяплыні.

Конь пад ездаком спатыкаецца — няўдача, храпець на — непагоду.

У даёнцы пеніцца млека — дождж будзе.

У хаце мурашкі — к шчасьцю.

Пададзе муха ў страву ці піцьцё — удача.

Мухі кусаюцца і прыстаюць — к непагодзе.

Гусь стаіць на аднэй назе — к марозу; лапу падкорчывае — к сьцюжы; крыльлямі хлопае—к марозу; пялешчыцца ў вадзе— к непагодзе.

Калі буцян (бусел, аіст) пакіне сваё гняздо раней чым трэба — спадзевацца пажару ці іншаго якога нешчасьця.

Буцян саўе гняздо на чыім будынку — шчасьця таму гаспадару і багацтва.

Бярозка як распусьціцца вясной пазьней за вольху — лета будзе сухім.

Груган каркае над будынкам—к нешчасьцю, калі-ж у тэй хатцы ёсьць цяжка хворы дык магчыма хаўтуры.

Вароны і каўкі лётаюць стадамі — чакай непагоды; як гэтыя самыя птушкі дый груганы лётаюць над войскам—будзе бітва.

Дзверы ніколі ня скрыпеўшыя заскрыпяць— прыкрасьць у хаце.

Дождж с пузырамі — будзе доўга даждлівая пагода.

Кажуць што дужа добра, калі сын падобны да маткі, а дачка — да бацькі.

Выходзячы з хаты за што колечы зачэпішся або што там забудзеш — хутка ізноў у тэй самай хаце будзеш.

Кошка хаваецца ў печку — к абноўкі; дзярэ падлогу — к гіхуры; сьцяну дзярэ — к непагодзе; сьпіць моцна лежучи дагары — к цяплыні, мыецца і трэ лапай за вухам — к госьцю.

Мышы зьявяцца у вялікім ліку — галодны год будзе. Мышы уцекаюць з хаты, ці карабля — перад нешчасьцем.

Мышы пагрызуць абуваньне і вопратку — к хаўтурам.

Мышы сена ядуць — неўдачлівы сенакос.

Мышы пішчаць — к галадоўцы.

Месяц тусклы — к марозу;
„ ясны — к сушы;
„ сіневаты — к дажджу;
„ ўчырвонасьці — к ветру.

Цьвіцяць пазногці — к гасьцінцу і абноўцы.

Хмары чырвоныя перад усходам сонца — к ветру.

Павук гнезьдзіцца над пасьцельлю — к шчасьцю.

Павук на вопратцы — к даходу.

Падошвы сьвярбяць — к падарожжы.

Кіслае яблыка нашча зьесьці ды запіць халоднаю вадой — цэлы дзень ня будзеш п'яным.

Пятух пяе курыцаю — ня добра.

Жанчына будучы у ціжары калі першых тры месяцы чуе сябе добра — носіць сына. Астатніх шэсьць месяцаў для яе трудны; калі ходзіць дачкой дык першых тры месяцы для яе цяжкімі будуць.

Броў правае сьвярбіць — спатканьне спрыяцелям.

Броў левая — абачыш фальшывага чалавека.

Сьвярбіць левае вока — плакаць; правае — вясёлым быць.

Ураджай на грыбы — к вайне.

Левая далонь сьвярбіць — атрымаеш грошы.

Правая — выдасі грошы.

Круг навакол месяца — к ветру.

Ясны шырокі круг навакол месяца — к пагодзе.

## Карысныя парады старых людзей.

Трынаццатым за стол не садзіся.

Пагась трэцюю сьвечку, як толькі ўтледзі — каб ня было бяды.

Не кладзі шапку (капялюх) і ключы на стале — с кім небудзь будзеш сварыцца.

Не разбурывай гнезда ластаўкі — калі ня хочаш мець вяснушкі на твары.

Пры закладцы будынку варта палажыць у фундамант троху грошаў, каб і будынак быў шчасьлівы на грошы.

Зашываць (лапіць) парваную вопратку ці ўшываць гузік на сабе — ня можна, аслабіш памяць.

Як пачуеш, што цябе нехта клікае па іменьні, там дзе нікога ня можа быць — не адзывайся — гэта кліча хвароба.

Закрывай кнігу калі чытаў, а садзішся абедаць — бо аслабіш памяць.

Не здароўкайся праз парог, калі ня хочаш сварыцца.

Ня трэба дазваляць маламу рабёнку глядзецца ў люстэрку, бо доўга ня будзе гаварыць і зробіцца баязьлівым.

Не рабі таго другому, што табе было б прыкра.

Шануй і паважай іншага, дык і той іншый цябе ушануе.

Даклярую што каму толькі тады, калі ведаеш што гэты даклерунак выпаўніў.

## Нешчасьлівыя дні ў гаду.

**У якіх не варта нічога важнага ні злога ні добрага распачынаць.**

Студзень 1. 2. 4. 6. 11 12. 20.
Люты 12. 17. 18.
Сакавік 1. 4. 14. 16.
Красавік 3. 7. 18.
Травень (май) 7. 8.
Чэрвень 7.
Ліпень 17. 21.
Жнівень 20. 21.
Верасень 10. 18.
Кастрычнік 6.
Лістапад 6. 8.
Снежань 6. 12. 18.

Табліца гэта сьпісана мною з даўнейшых таемных кніг. Нікога нязмушаю я верыць ей або ня верыць. Кажу, што нат' Японцы паважна гэтыя лічбы трактуюць.

# Гадальная таблiца

## ХІРАМАНТА

## А. Васілеўскага.




Як гадаць, глядзі паясьненьне на стар. 65.

# ПАЯСЬНЕНЬНЕ.

## Як трэба гадаць на табліцы хіраманта Васілеўскага.

Ты бачыў сон. Устаўшы вазьмі жытняе зярно левай рукой і кідай зьверху на твар нарысаваны на табліцы, маючы ў думцы адно пытаньне. «У якім месяцы выпаўніцца сон?».

Кідай колькі разоў, аж пакуль зярно пападзе на адну з рымскіх лічбаў.

Лічбы гэтыя маюць вось якое значэньне I—Студзень, II—Люты, III—Сакавік, IV—Красавік, V—Май, VI—Червень, VII—Ліпень, VIII—Жнівень, IX—Верасень, X—Кастрычнік, XI—Лістапад, XII—Сьнежань.

Як даведаешся ў якім месяцы сон выпаўніцца, дык трымаючы ў думцы запытаньне: «Якога дня выпаўніцца?» кідай ізноў зярно. Яно мусіць папасьці на кола з арабскімі лічбамі ад (1) да трыццаць аднаго (31). Лічбы гэта — дні месяца.

Можеш яшчэ задумаць пытаньне: «З кім тады буду мець дачыненьне?» ізноў кідай левай рукой зярно. Трэба каб яно ўскацілася на кола, дзе напісаны назовы планэтаў.

**Прыклад:** я бачыў сон. Думаю: «у якім месяцы ён выпаўніцца». Кідаю зярно трапляе яно на рымскую лічбу XII значыць сон выпаўніцца ў Сьнежні!

Сабе думаю: «Якога-ж дня чакаць выпаўненьня?» кідаю ізноў зярно, трапляе яно на лічбу 12 — ага! значыць дванаццатага Сьнежня!

Ну, а з кім-жа гэта я буду мець дачыненьня тады?» сабе думаю і кідаю зярно. Успадае яно на клетку, дзе стаіць слова «Мэркур». Глянуўшы на старонку, дзе надрукавана значэньне назоваў плянэт я бачу, што буду мець дачыненьне з гандляром...

У тым самым плянэтным коле ёсьць дзьве клеткі са славамі «+Плюс», «—Мінус». Устаўлены яны дзеля таго, каб Ты мог наперад прадугадаць, ці тоя спатканьне (аб якім сон прарочыць), будзе ўдачлівым, ці не. Зярно кідай з запытаньнем «Ці добра будзе ці дрэнна?

Дзеля таго, што будзе ня лёгка трапіць зярном на гэтыя клеткі навучышся цярплівасьці, а гэта ужо карысьць!

## Сымбалічнае значеньне назоваў плянэтнага кола.

| | | |
|---|---|---|
| XI + | **Плюс** | = Добра. |
| XII— | **Мінус** | = Ня дужа добра. |
| I | **Сонца** | = Вялікія паны, людзі знамянітыя, багатыя, слаўныя. |
| II | **Месяц** | = Падарожнікі, артысты, цыганы. |
| III | **Мэркур** | = Вучоныя, дактары, гадляры, |

| | | |
|---|---|---|
| IV | **Вэнэра** | = Маладзіцы, дзяўчаты, або й мужчыны характару жаночага (ветлівыя, кахаючыя, мягкія, зьменныя, добрага сэрца. |
| V | **Марс** | = Людзі вайсковыя, кавалі, мясьнікі, гандляры жалезам і мясам і г. п. |
| VI | **Анта** | = Выдумлчыкі аружжа, газаў, падкопаў, узрываў, пораху. |
| VII | **Юпітр** | = Урадоўцы, духоўнікі. |
| VIII | **Сатурн** | = Адвакаты, судзьдзі, землямеры, інжэнеры па зямле і вадзе, старыя людзі. |
| IX | **Уранус** | = Пісьменьнікі, паэты, яснавідучыя, прарокі, варажбіты. |
| X | **Нэптун** | = Вадалазы, рыбакі, перавозьнікі, лодачнікі, параходнікі. |

# ARAKUŁ

Hadajučy treba ŭziać ziernia, albo kruhłuju krošku chleba i kidać na siaredzinu malunku (na twar), a potym, u pryłożanych adkazach znajści ličbu na jakoj zatrymałasia ziernia i na swajo pytańnie atrywaješ adkaz.

1. Żmudnaj i ciažkaj pracaj dawiadzieš da kanca swaju sprawu. Ninakoha nie narakaj, bo sam u hetym winawaty.

2. Niaščaśćcia i biedy stajać na twajoj darozie. Wyściarahajsia ludziej, na jakich pałaje złośćciu twajo serca.

3. Rozumam, pracaj i sprytam dojdzieš da dastatku. Pieradčasna nie ryzykuj, bo ŭsio straciš.

4. Boh tabie dapamoža. Nia smucisia i ničoha nia bojsia, staiš na dobraj darozie.

5. Nie rabi kryŭdy ludziam i jany tabie tady ničoha złoha rabić nia buduć. Daznaješ kryŭdy ad worahaŭ swaich, pieraciarpi — pieramožaš.

6. Što maješ na dumcy swajoj, toje spoŭnicca, ale nia tak skora, jak chočaš; budź cierpialiwym.

7. Wialikaja radaśc spatkaje ciabie, i šmat dabra daznaješ ad ludziej, nie zaznawajsia i ščaśćcie nie pakinie ciabie.

8. Ad chwaroby da zdaroŭja, a ad smntku da radaści nakieruje ciabie Boh; žyćcio twajo pieramienicca na lepšaje.

9. Nie haračysia, bo što maješ, dyk i toje straciš, papraŭ na lepšaje swaju žyćciowuju pucinu, niachaj zajaśnieje jana dobrymi ŭčynkami.

10. Twaje smutki spraŭlajuć radaść druhim. Idzieš mylnaju darohaju. Papraŭsia, a Boh tabie dapamoža.

udź sumiennym, jak dahetul, a ŭsie biedy, što čornymi chmarami pawiśli nad taboju, źniknuć, jak dym.

12. Wialikimi miłaściami abdaryć ciabie Boh. Dumki twaje spoŭniacca. Rabi, jak i dahetul ludźiam dabro.

13. Taho čaho dabiwajeśsia nie tabie, a inšamu dastaniecca, bo da mety idzieš nie papraŭdzie. Niachaj serca twajo nia budzie dla ludziej takim akamianiełym.

14. Ciažkaja i sumnaja twaja žyćciowaja pucina. Pakajsia pierad Boham, a Jon ciabie miłaściami abdaryć i ŭchilić ad ciabie ŭsio złoje.

15. Žadańni twaje nia spoŭniacca; toje, što tabie pryabiecana nie dastanieš. Pieramiani žyćcio—daznaješ spakoju.

16. Złymi ŭčynkami nia psuj swajho spakojnaha žyćcia.

17. Nie sumlewajsia ŭ sprawiadliwaści Božaj, a pomač, ab jakoj prosiš, budzieš mieć.

18. Kali chočaš dobraha žyćcia, rabi dla ludziej dobrym słowam, a Boh tabie adpłacić dobrymi ŭczynkami.

19. Woś tabie maja rada: trymaj jazyk za zubami, budzieš jeści kašu z pirahami.

20. Darma spadziajeśsia na wialikuju sławu. Ničoha z hetaha, čaławieča, nia budzie.

21. Na dwoje babka waražyła: trymajsia lepš adnaho, spakajniejšy budzieš.

22. Nie pakładajsia na swaje siły, a tolki na łasku Božaju. Kali zachočaš—budzieš ščaśliwym.

23. Nie hrašy i wykiń z haławy nikčemnyja dumki, bo jany dawiaduć ciabie da zhuby.

24. Maješ šmat chłopataŭ. Kali ŭmieła i wytrywała woźmieššia za dzieła—budzieš zadawolęny.

25. I da ciabie zawitajuć lepšyja dni. Pieramiena skora nastupić.

26. Za prykładnaje žyćcio, wialikimi dastatkami abdaryć ciabie Boh.

27. Šalonaja dumka zradziłasia ŭ twajoj haławie Kali z wieraju i praŭdaju padyjdzieš da jaje—budzieš ščaśliwym.

28. Śmat worahaŭ maješ za swoj jazyk. Lišniaha nie brašy, a žyćcio twajo palepšaje.

29. Nadzieja twaja nie zawiadzie ciabie—budzieš. u dastatkach, ale da hetaha dojdzieš dobrymi ŭčynkami dla swaich bližnich.

30. Nia leź pieradčasna ŭ piatlu, bo kiepska budzie, Razważ dobra, abmiarkuj, abdumaj.

31. Pamučyššia mnoha pakul pazbudzieššia swaje biady. Praŭda, ščyraść i luboŭ da ludziej pamohuć tabie ŭ hetym.

32. Toje ab čym dumaješ i što nosiš u swajoj haławie—zrealizujecca.

33. Nia radasnaje i bahataje twajo žyćcio. Sam winawaty. Mieniej hulaj, a bolš pracuj—pieramieny chutka dačakaješšia.

34. Wialikaja radaść čakaje ciabie. Nia imknisia da jaje pieradčasna, bo ŭciače. Idzi pa śladoch praŭdy, ścierażysia ŭsiaho błahoha—budzieš ščaśliwym.

35. Kali bolš času achwiaruješ haspadarcy, a

mienš karčmie i wulicy—žyćcio twajo pieramienicca na lepšaje.

36. Nia smucisia i nia sumuj: što straciŭ — nia wiernieš. Z wieraju, praŭdaju i pracaju padychodź da nowaha žyćcia, a žyć ščaśliwa budzieš.

37. Błahi čaławiek padlizwajecca i ašukiwaje ciabie; nia wier jamu.

38. Na ŭsialakuju chwarobu lakarstwa jość: pastarajsia znajści i na swaju.

39. Kab nia było kiepska, ściarażysia złości—jana twaja zhuba.

40. Nie rabi druhim złoha i tabie jaho rabić nia buduć. Pastarajsia prymiryccą z worahami.

41. Sonca świecić adnolkawa i na bahataha i na biednaha, na chworaha i na zdarowaha. Niachaj i twaje pastupki nia znajuć hetaje rožnicy.

42. Śmieła i nia bajučysia idzi za pryzywam swajho serca.

43. Nia idzi toju darohaju, na jakoj staiš: šmat worahaŭ maješ, ściarażysia ich. Pieramiani swaju žyćciowuju pucinu—pazbudzieššia mnoha złoha.

44. Nie pa siłach swaich zadumaŭ ty sprawu. Pakul nia pozna—raźwitajsia z joju.

45. Niama taho błahoha kab na dobraje nia wyjšła. Nia bojsia—usio dobra budzie.

46. Smat treba potu wylić, kab dabicca taho, što maješ na dumcy.

47. Pakornaje cialatka dźwie matki sasie, ale nie zaŭsiody, sytym bywaje. Nie karysia pierad losam, a adważna prabiwaj sabie darohu da lepšaje budučyni. Śmialej hladzi na świet.

48. Choć i na soncy jość plamy, ale nia radžu tabie łažyć plamy na swajo sumieńnie jano i tak u ciabie nia zusim čystaje.

49. Čakaj Paŭluk Piatra—budzieš syr jeści: kali budzieš siadzieć złažyŭšy ruki, dyk nia tolki syra a i bulby mieć nia budzieš.

50. Sto kamu balić, toj ab tym i kryčyć: tabie-ž jašče ničoha nie balić, a ty ŭžo pačynaješ lamentawać: Prykusi jazyk — worahaŭ nia budzieš mieć i da arakuła za paradaj źwiartacca nia treba budzie.

51. Niachaj dobryja dumki, zamiest złych, jakimi nabita twaja haława, zapanujuć twaim sercam—adšukaješ spakoj i lepšaje žyćcio i žadańni twaje tady spoŭniacca.

52. Bojsia ludziej nie twajho stanu — źwiaduć ciabie i na wieki skalečać twajo žyćcio. Trymajsia swaich.

53. Tak jak ty chočaš, hetak i budzie, ale musiš pastaracca znajści da hetaha adpawiednuju darohu.

54. Z twajoj sprawy ničoha nia budzie. Panadziejsia na ludziej — pojdziesz biaz botaŭ i łapciej. Treba i samomu pracawać.

55. Sto maješ u haławie nie adpawiadaje tamu što nosiš u sercy. Uzhodni dumki z sercam, uniknieš šmat čaho złoha.

56. Scierażysia swaich pryjacielaŭ, zamyšlajuć proci ciabie złoje.

57. Spakoj, radaść i zdaroŭje zapanujuć u twajoj dušy, kali źmieniš adnosiny da ludziej.

58. Ścierażysia swaich worahaŭ. Nie swarysia z imi, a pastarajsia lepš prymirycca.

59. Ad złoha wyratawaŭ ciabie Boh; ścierażysia, kab iznoŭ nie papaści ŭ biadu, bo kiepska budzie.

60. Malisia—żadańni twaje spoŭniacca.

61. Twaje zamiery, ab jakich dumaješ, pamohuć tabie, jak kašal chwarobie. Pieramiani ich na lepšyja.

62. I nia dumaj nawat ab hetym — usio roŭna ničoha nia wyjdzie.

63. Na Boha spadziawajsia, ale i sam ruk nie apuščaj. Dobryja ŭčynki dla ludziej—pamohuć tabie ćwiorda stać na nohi.

64. Nie ławi rybki ŭ mutnaj wadzie, bo prapadzieš. Ab kim dumaješ — i wucham nawat nie wiadzie.

65. Nie dla psa kiłbasa. Wykiń nawat i dumki z haławy, bo ničoha nia budzie.

66. Worahaŭ swaich nia bojsia, čaławieča, ničoha złoha tabie nia zrobiać: swajoju dabratoju ty pieramożaš ich.

67. Padarożża, ab jakim ty latuciš, pryniasie tabie tolki smutak i ślozy. Siadzi lepš u chacie.

68. Nie chwalisia swajoju pieramohaju, bo nia wiedaješ, što zaŭtra jaszcze budzie z taboju. Nie każy hop, pakul nie pieraskočyš.

69. Choć myślami ty i staraješsia rabić ludziam dabro, ale pastupkami swaimi ty robiš tolki kryŭdu. Rabi naadwarot—spakoju i radaści daznaješ.

70. Nie kapaj druhomu jamu bo sam u jaje ŭwališsia.

71. Nia budź zdradnikam narodu swajho. Pakajsia i pačni karysnuju dla jaho pracu.

72. Kožnaja bylinka i kožnaja twaryna stworany na karyść ludzkaści. Waźmi z ich prykład i rabi ludziam dabro i žyćcio twojo tady pieramienicca.

73. Smutak twoj, pieramienicca na radaść. Usio budzieš mieć, worahi twaje pakłoniacca tabie.

74. Nie lanujsia, tady skora zdabudzieš toje, ab čym ciapier tolki dumaješ.

75. Nie zakapywaj swaich talentaŭ u ziamlu, a addaj ich lepš na karyść swajho narodu.

76, Nikoli nia spoŭniacca twaje dumki.

77. E...e...e!. Čaławieča, za karotkija ruki: papracuj, pryhledźsia, pawučysia, tady tolki idzi da mety.

78. Kiń smutki i ślozy—ničoha nia zrobiš. Z raspahodžanym twaram wychodź u świet šyroki.

79. Dobryja twaje, čaławieča, dumki. Boh paciešyć ciabie i abdaryć dabrom i radaściaj.

80 Papraŭsia! Nie paprawišsia—prapadzieš.

81. Tolki rak moža iści nazad. Stydna! Idzi pa toj darozie na jakuju staŭ ciapier—ščaśliwiejšy budzieš.

82. Ab čym dumaješ—ciapier nia spoŭnicca. Treba pačakać.

83. Biŭ baćka syna nie zatoje što ihraŭ, a zatoje što adyhrywaŭsia. Cymś marnawać hrošy na hulanki i na karty, kupi lepš biełaruskuju knižku dy hazetu.

84. Pažywi — usiaho dawiedaješšia.

85. Tolki siarod swaich ludziej znojdzieš padtrymańnie twaim dumkam.

86. Boh dapamoża tabie ŭ twaich dobrych pačynańniach.

87. Kaho dumaješ pabačyć — pabačyš i nawat skora.

88. Chłopatami i sumam usłana twaja daroha. Sprawu wyjhraješ—usio pieramienicca.

89. Śmat worahaŭ paluje na ciabie: aściarahajsia, bo moża być kiepska.

90. Na toje i ščupak u wadzie, kab karaś nie dramaŭ. Kali nie ačuchaješšia i nia wožmieššia da pracy, usio straciš.

91. Wiłami pa wadzie pisana. Nia spoŭnicca,

92. Smačny žabie harech dy zuboŭ Boh nia daŭ. Woś abłasawaŭsia. Małako na hubach wytry.

93. Praz niekalki hadkoŭ padumaj ab hetym, a ciapier tabie jašče zarana.

94. Pałaży nadziei na Boha.

95. Praŭda twaja ŭ pastupkach twaich. Rabi i spadziawajsia na pomač Boha.

96 Nia spoŭnicca nadzieja twaja, kali budzieš ličyć tolki na swaje siły, a nie na dapamohu Boha.

97. Dumka twaja spoŭnicca. Slach pa jakim musiš išci znojdzieš u biełaruskaj hazecie.

98, Nie biaduj—skora palepšaje.

99. Nie praklinaj swaich worahaŭ, bo i siarod ich ty maješ pryjacielaŭ.

100. U biełaruskich knihach znojdzieš adkaz na swaje dumki.

## ZNAČEŃNIE DARAHICH KAMIEŃNIAŬ

Darahija kamieńni majuć upłyŭ na charaktar i los čaławieka, jaki ich nosić. Kožny kamień, zhodna swajoj asabliwaści, prynosić čaławieku albo ščaście, albo niaŭdaču.

Almandzin i Hranit—spryjaje žanimstwu i lečyć serdečnyja rany.

Aleksandryt i Jašma—służać symbolem praŭdziwaści i prastoty, prynosiać ščaście ŭ handlu i padarožach.

Akwamaryn zachoŭwaje ad niebiažpiekaŭ daje pieramohu nad worahami.

Ametyst achowuje ad błahoha i złoha i daje paśpiech u nawukach. Jon źjaŭlajecca emblemaj nawuki i duchowaje mahutnaści.

Agat—u jaho ličbu ŭwachodzić pamarančawy „Serdalik" niabieski „Sapfir" i krywawaha koleru „Chalcedon" dajuć wieru, adwahu, uładu i pieramohu.

Biruza—dobruju pamiać, družbu, ale dla niekatorych hety kamień źjaŭlajecca nieščaśliwym, jak i „Opał".

Bieryl — spryjaje prazorliwaści i stasunkam z niewidomymi duchami.

Bryljant — prynosić ščaście ŭ ihry i kachańni.

Chałcedon — prynosić ćwiordaść, siłu woli roŭnawahu.

Chryzalit i Topaz — dajuć mudraść, sławu, bohaćcie.

Burštyn — łahodzić nerwy. Pacierki z burštynu karysny dla nerwowych.

Izumrud źjaŭlajecca symbolem cnoty i emblemaj dastatku, ščedraści i wysokich nadziejaŭ.

Karbunkuł — daje ŭzajemnaje kachańnie.

Koral — zachoŭwaje ad usiaho złoha.

Opał — prynosić niaščaście, chwarobu, swarki i smutak.

Rubin — daje siłu, adwahu, zachowywaje ad niebiaźpiekaŭ.

Sierdalik — jość symbol radaści i wiasiella.

Sapfir — symbol ščaścia, mudraści i pryhožaści.

# Беларуская Кнігарня

## Ст. Станкевіча

Прапануе розные падручнікі для беларускіх і польскіх пачаткавых і сярэдніх школ, а таксама ўсе пісьменныя і канцэлярскія прылады.

**Вялікі выбар кніжак да чытаньня і сцэнічных твораў.**

Беларускія і польскія календары (кніжкі і адрыўныя) і сьценкі да календароў на розныя цэны.

**Флірты, соннікі, сьпеўнікі**

ў беларускай і польскай мове.

ЖУРНАЛЫ МОДАЎ.

**Цэны самыя нізкія.**

Для прадаўцоў вялікая уступка, заказы высылаюцца на атрыманьні задатку ня менш трэцяй часьці. Выпаўненьне хуткае і акуратнае.

**Адрэс: Вільня, Вострабрамская вуліца № 2.**

Drukarnia „DZIEŁOWA*, Wilno, ul. Zamkowa 16